ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 50 (1687) | Пятніца, 22 чэрвеня 1962 года | Цана 4 кап.



ВЕЧНА ЖЫВЫЯ.

Фота Ул. КРУКА.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

САВЕЦКАЯ ПАРТЫЙНА-ЎРАДАВАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ Ў РУМЫНІІ

ДА ВЫНІКАЎ РАЗМОВЫ АБ ТЭАТРАЛЬНЫМ МАСТАЦТВЕ

ДУМКІ АБ ПРАПАГАНДЗЕ СУЧАСНАЙ МУЗЫКІ

УСПАМІНЫ ПРА ЯНКУ КУПАЛУ

АПАВЯДАННЕ АЛЕНЫ ВАСІЛЕВІЧ

САРДЭЧНАСЦЬ І АДЗІНСТВА

Некальні дзён госціць на сяброўскай румынскай зямлі савецкая партыйна-ўрадавая дэлегацыя на чале з Першым сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчовым.

Вуліцы гарадоў і вёсак Народнай Румыніі ў святочным убранні. Усюды гучаць радасныя песні аб вялікай дружбе паміж савецкім і румынскім народамі, аб непарушным адзінстве нашых краін. Працоўная Румынія гасцінна расчыніла дзверы свайго дома пасланцам савецкага народа і, вітаючы дэлегацыю СССР, аднадушна скандуе на сустрэчах: «Румынія — Савецкі Саюз!», «РРП—КПСС!», «Будзем працаваць, будзем змагацца, будзем абараняць мір!..»

Аб непарушнай дружбе двух народаў сведчаць і перагаворы паміж партыйна-ўрадавымі дэлегацыямі Савецкага Саюза і Румынскай Народнай Рэспублікі, якія праходзяць у атмасферы сардэчнасці і братэрства.

У гэтыя дні савецкія госці атрымалі шмат запрашэнняў наведаць гарады, прадпрыемствы, кааператывы Румыніі. Першая з сустрэч адбылася на Бухарэсцкім заводзе «Грывіца рошые». На заводзе савецкіх гасцей сардэчна сустракалі рабочыя і работніцы. У прасторным, па-святочнаму ўпрыгожаным вагона-рамонтным цэху адбыўся мітынг, у якім прынялі ўдзел звыш дзесяці тысяч рабочых і работніц «Грывіца рошые».

З вялікімі прамовамі выступілі на мітынгу Першы сакратар ЦК КПСС і Старшыня Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчоў і Першы сакратар ЦК РРП, старшыня Дзяржаўнага Савета РНР Г. Георгіў-Дэж.

У наступны дзень савецкія госці выехалі ў паездку па краіне. Іх суправаджаюць кіраўнікі ўрада Румынскай Народнай Рэспублікі.

М. С. Хрушчоў і Г. Георгіў-Дэж перад пачаткам перагавораў паміж партыйна-ўрадавымі дэлегацыямі Савецкага Саюза і Румынскай Народнай Рэспублікі.

Фота спецыяльнага карэспандэнта ТАСС В. СОБАЛЕВА. (Здымак прыняты па фотатэлеграфе).

ТРЫБУНА ВЫСОКІХ ДУМАК, ВЯЛІКІХ ПАЧУЦЦЯЎ

Да вынікаў размовы аб тэатральным мастацтве

НА ПРАЦЯГУ апошніх пяці месяцаў на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» ішла размова аб тэатральным жыцці рэспублікі. Пачынаючы яе, рэдакцыя запрашала артыстаў і рэжысёраў, драматургаў і крытыкаў, мастакоў і гледачоў, — усіх, хто зацікаўлены ў росквіце сцэнічнага мастацтва, сказаць сваё шчырае слова.

Неабходнасць такой размовы відавочная. XXII з'езд Камуністычнай партыі, новая Праграма КПСС паставілі перад літаратурай і мастацтвам, у тым ліку і тэатральным, задачу больш актыўнага ўздзеяння і ўплыву на светапогляд і душэўны свет савецкіх людзей.

Мастацтва — крыніца радасці, сказана ў новай Праграме партыі, радасці адкрыцця тэм, думак, душэўнага багацця савецкага чалавека.

Можна прыгадаць шмат твораў, якія глыбінёй свайго зместу, яскравасцю ўвасаблення адпавядаюць гэтаму высокаму вызначэнню.

На жаль, сапраўдную радасць гледачы перажываюць яшчэ вельмі рэдка. Руціна, штампы, ілюстрацыйнасць, шэрае рамесніцтва яшчэ жывуць у тэатры. На прыгожай ніве нашага мастацтва сям-там тырчыць калючы дзядоўнік «непарушных» догмаў і канонаў. Інерцыя прызвычаенасці да знаёмага і абжытага яшчэ часта перашкаджае тэатрам убачыць і распазнаць новае, хоць усе ведаюць, што толькі пошукі і адкрыцці новага рухаюць мастацтва наперад, жывяць яго.

Мінулы год тэатры рэспублікі закончылі даволі высокім фінансавым недаборам. Хоць фінансавы поспех тэатра не заўсёды раўназначны творчаму, тым не менш і лічбы часам могуць гаварыць красамоўна. А лічбы недавыканання фінансавага плана ледзь не на трыста тысяч рублёў гавораць, што шматлікія гледачы чамусьці не хацелі наведваць спектаклі нашых тэатраў. Чаму?

Шукаючы адказу на гэтае пытанне, многія ўдзельнікі дыскусіі гаварылі аб сур'ёзных творчых і арганізацыйных недахопах у тэатральным жыцці. Але ні ў кога з іх і думкі не было, што тэатр паміраe, дажывае свае апошнія гады, як «прадракаюць» яму некаторыя. Тэатр будзе жыць! Гэтымі словамі Я. Рамановіч назваў свой артыкул, і яны надзвычай трапна перадаюць эснову напрамак дыскусіі. «Тэатр жа высокай думкі і мастацкай культуры, — піша Я. Рамановіч, — ніколі не памрэ. Творчы працэс жывога чалавека — акцёра не заменіць ніякі аўтамат, тэлевізар, самае ідэальнае стэрэафанічнае, аб'ёмнае, каляровае кіно, панарама і ўсе іншыя здабыткі нашага часу, якія маюць сваё самастойнае мастацкае значэнне».

І ўдзельнікі дыскусіі заклікалі змагацца імённа за такі тэатр — тэатр высокай думкі і вялікіх пачуццяў, каб кожны спектакль быў святам культуры, як сказала ў сваім выступленні загадчыца Гомельскай дзіцячай бібліятэкі Е. Завяртайла.

ПРЫ УСІХ НЕДАХОПАХ тэатральнага мастацтва ніхто не толькі не адмаўляе яго відавочнага росту. Гэты рост можна заўважыць у спектаклях не толькі сталічных, а і абласных калектываў. І вельмі ж правільна пісаў Б. Бур'ян у сваім артыкуле «Каб не згасаў агонь творчасці» аб нашых «перыферыйных» тэатрах: «Некаторыя спектаклі, паказаныя артыстамі Магілёва ці Брэста, могуць паспаборнічаць у смеласці рэжысёрскіх пошукаў і арыгінальных трактовак з тым, што паказваюць нам купалаўцы».

Але на шляху росту ёсць яшчэ шмат такога, што прымусіла ўдзельнікаў дыскусіі гаварыць з трывогай пра асобныя з'явы тэатральнага жыцця.

Сур'ёзную занепакоенасць выклікала пытанне творчага супрацоўніцтва тэатраў з беларускімі драматургамі. Яму, у прыватнасці, аддаў значную ўвагу Алесь Звонак у артыкуле «Пагаворым шчыра».

Адзначыўшы відавочны зрух у развіцці беларускай драматургіі напярэдадні XXII з'езда КПСС, калі некаторыя беларускія тэатры паставілі па тры-чатыры арыгінальныя спектаклі за год (чаго даўно ўжо не было), аўтар з поўнай падставай піша: «...Зробленае ў вельмі нязначнай меры вырашае пытанне арыгінальнага рэпертуару, а размова ідзе імённа аб гэтым: які ўклад у агульную скарбніцу мастацкіх багаццяў шматнацыянальнага тэатральнага мастацтва краіны зрабілі беларускія тэатры, беларуская драматургія», бо «асноваю іх работы і сэнсам іх існавання з'яўляецца стварэнне яркіх, жыццёва-праўдзівых нацыянальных спектакляў... самае шырокае і паўнакроўнае адлюстраванне жыцця рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі нашай рэспублікі».

Можна спрачацца з Алесем Звонакам аб ацэнцы некаторых беларускіх п'ес і спектакляў, але нельга не пагадзіцца з ім, калі ён паправае асобныя тэатры за іх інертнасць у рабоце з беларускімі драматургамі. Такая інертнасць сапраўды ёсць, аб ёй гавораць і пішуць з году ў год. Часам ставраецца ўражанне, што некаторыя тэатры ставяць арыгінальныя п'есы, як «адчэпнае», без высокай патрабавальнасці да сябе і драматургаў.

Праявы такой інертнасці асабліва заўважаюцца ў рабоце нашых абласных тэатраў. Тыя, калі і ставяць арыгінальныя п'есы, то толькі «другім экранам», пасля апрабацыі іх на сталічнай сцэне. Абласныя калектывы не шукаюць «сваіх» аўтараў, займаюць спажывецкую пазіцыю пры стварэнні рэпертуару.

На жаль, Б. Бур'ян у сваім артыкуле па сутнасці падтрымаў гэтую пазіцыю. На яго думку, абласныя тэатры павінны разглядаць п'есы беларускіх драматургаў, як творы, «якія ўступаюць у спаборніцтва з іншымі драмамі і камедыямі», таму што яны, перакладзеныя на рускую мову, быццам бы перастаюць быць нацыянальнымі. Наўрад ці мэтазгодна арыентаваць нашы абласныя калектывы на такую «ўраўнілаўку», бо перад імі стаіць тая ж самая задача —у першую чаргу паказаць жыццё сваёй рэспублікі, у якой яны жывуць і працуюць і якую прадстаўляюць у сваіх гастрольных паездках у іншыя брацкія рэспублікі. А гэта азначае, што абласныя тэатры павінны больш актыўна працаваць з «мясцовымі» аўтарамі. І калі б такая праца праводзілася сістэматычна, з душой і сэрцам, — беларуская драматургія, а тым самым і тэатральнае мастацтва сёння былі б куды багацейшыя, а ўклад іх у шматнацыянальную культуру краіны куды больш значны.

Каб апраўдаць сваю інертнасць у стварэнні арыгінальнага рэпертуару, тэатры часта абвінавачваюць драматургаў, што яны прыносяць недапрацаваныя, «сырыя» п'есы, спадзеючыся, што рэжысёр і акцёры «дапішуць» іх у працэсе пастаноўкі. Так, тэатры сапраўды атрымліваюць нямала п'ес, якія п'есамі можна назваць толькі ўмоўна. І яны правільна робяць, калі адмаўляюцца працаваць за драматурга.

Але гаворка не пра гэта. Гаворка пра сапраўдны творны кантакт драматурга і тэатра. На якіх прынцыпах ён узнікае і павінен будавацца? Ці тэатр павінен чакаць толькі «гатовую прадукцыю» і не дакранацца да тэксту п'есы, ці спектакль павінен нараджацца ў сумеснай працы драматурга з тэатрам, калі тэатр сваім калектыўным вопытам памагае аўтару давесці п'есу да патрэбнай «кандыцыі»?

На гэтае пытанне даў слушны адказ Алесь Звонак, падкрэсліўшы, што «ўстаноўка тэатра на «гатовую прадукцыю», на «закончаны» драматургічны твор... азначае фактычнае адмаўленне работы з аўтарам..., што бадай ніводзін тэатр у краіне не прытрымліваецца такой устаноўкі».

Звернемся, урэшце, да гісторыі тэатра. Агульнавядома, якую вялікую дапамогу аказаў МХАТ Чэхаву і Горкаму ў іх працы над п'есамі, дапамогу, за якую абодва яны былі глыбока ўдзячны тэатру. Вядома, што вахтангаўскі тэатр прапанаваў М. Горкаму сваю канцэпцыю «Ягора Булычова і іншых», з якой ён з радасцю згадзіўся і паводле якой карэнна перапрацаваў п'есу.

А беларуская драматургія? Колькі п'ес, якія цяпер у яе «залатым фондзе», вырасла імённа ў выніку творчага супрацоўніцтва драматургаў з тэатрамі. Ні «Канстанцін Заслонаў», ні «Выбачайце, калі ласка!», ні «Папараць-кветка», ні многія іншыя п'есы не былі паставлены ў іх першапачатковых варыянтах.

Гісторыя і сённяшняя практыка тэатраў даказалі, што спектакль — канчатковы вынік творчай садружнасці тэатра і драматурга, і трэба не «чакаць», а трэба **шукаць драматурга**, не трэба «дапісваць» за яго, а трэба памагаць яму.

ТЭАТР... Яго дзейнасць будзе сапраўды плённай, калі драматургі і майстры сцэны будуць глыбока адчуваць патрабаванні жыцця, усведамляць сваю мэту і прызначэнне ва ўсенароднай барацьбе за светлазорную будучыню. Што ж сёння павінна стаць самым галоўным у тэатральнай творчасці?

Найбольш выразна пра гэта, бадай што, сказаў у сваім выступленні ў клубе Саюза пісьменнікаў Л. Рахленка. Ён закрануў адно з кардынальных пытанняў сучаснага тэатра — неабходнасць адлюстравання на сцэне героікі нашай эпохі. Гераічныя вобразы вельмі рэдка з'яўляюцца ў нашых п'есах, і акцёры амаль развучыліся іграць такія ролі. У той жа час рэпертуар засмечваецца прахаднымі, «хасавымі» спектаклямі, сілы і талент рэжысёры і выканаўцы растрачваюцца на малазначныя пастаноўкі.

Слушна пісаў драматург П. Васілёўскі ў сваім артыкуле: «Як часта яшчэ на старонках драматычных твораў і ў тэатральных спектаклях дзейнічаюць героі, прызначаныя ўвасабляць нашых сучаснікаў, але якія ў сапраўднасці, апрача адзення, не маюць ніякіх іншых адзнак сучаснасці... Міжволі ўзнікае пытанне: ці пазнаюць нашы нашчадкі ў гэтых хадульных персанажах нястомных і акрылёных будаўнікоў светлай будучыні?»

Сёння сцэна прагне героя з глыбокім інтэлектуальна-філасофскім светам, — пра гэта гаварылі многія ўдзельнікі дыскусіі: І. Лакштанаў, Б. Браганцаў, М. Чапрасаў, З. Зайцава.

І, відаць, не выпадкова ўзнікла спрэчка вакол п'есы і спектакля «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна.

Р. Бярозкін правільна патрабуе, каб герой нашага часу ў мастацкім творы быў разумны, лагічны ў сваіх учынках, ведаў бы, што такое душэўная далікатнасць і такт, тонка ўмеў аналізаваць чалавечыя пачуцці і г. д.

Аднак станоўчы герой не абавязкова павінен быць ідэальным. Напрыклад, Гаворка з п'есы «Выгнанне блудніцы». Ён — звычайны чалавек нашага часу, мае свае недахопы, ён можа памыляцца і сумнявацца, можа быць жартаўлівым і сур'ёзным, можа штосьці не разумець і разам з тым ён—актыўны ўдзельнік нашага жыцця.

Ці можна такога героя мастацкага твора назваць станоўчым? Ул. Няфёд у сваім артыкуле «Герой і час» выразна адказаў на гэтае пытанне. Так, можна. «...Станоўчы чалавек такі зусім не таму, што ён збірае ў сабе ўсе вядомыя нам лепшыя рысы і якасці чалавека цяперашняга і будучага. Такога чалавека цяжка сабе ўявіць. Станоўчасць можа і павінна вызначацца асноўным крытэрыем: карыснасцю чалавека для нашага грамадства», — піша Ул. Няфёд.

Але Р. Бярозкін абсалютна правільна лічыць, што «нашы драматургі часта выдаюць за станоўчы характар такога героя, які пры бліжэйшым разглядзе аказваецца ідэйна нязначным і жыццёва збедненым або проста мала цікавым і сумным... Сучасны савецкі чалавек павінен быць паказаны на нашай сцэне ва ўсім багацці сваіх духоўных сіл і магчымасцей, ва ўсёй разнастайнасці і харастве сваіх практычных спраў».

Са свайго боку мы маглі б дадаць, што толькі пры гэтай умове на нашу сцэну вярнуўся б той грамадзянскі пафас, якога так нестае сёння ў многіх спектаклях. Грамадзянскі пафас — цэнтральны нерв тэатральнага мастацтва, ён надае невымерную сілу думкам і пачуццям герояў на сцэне. Колькі п'ес, вобразаў, цікавых думак прайшло міма ўвагі гледачоў толькі таму, што тэатр не здолеў зачапіць гэты нерв, уключыць яго ў сетку высокага напружання грамадзянскіх пачуццяў, без якіх тэатр ва ўсе часы і эпохі не мог выконваць сваю місію трыбуна — уладара думак.

Смелая грамадзянская думка ў п'есе нараджае, як правіла, і смелае новатарскае вырашэнне яе на сцэне. Успомнім спектаклі «Крыніцы» — у коласаўцаў, «Ліса і вінаград» — у купалаўцаў, «Аптымістычную трагедыю» — у Рускім тэатры.

Але як яшчэ мала такіх новатарскіх узлётаў! Драматургі і тэатры, на жаль, пакуль што шукаюць новае больш у сюжэтных нечаканасцях, кінематаграфічных наплывах і ультрамодным, часам экстравагантным афармленні, забываючыся часам, што нечаканыя кампазіцыйныя прыёмы, незвычайнасць і вастрыня рэжысёрскай і акцёрскай думкі, тэхнічныя вынаходніцтвы на сцэне самі па сабе яшчэ не азначаюць наватарства. Калі ў творы няма наватарскага зместу, новых думак і высокамастацкіх вобразаў, то ніякія іншыя «вынаходніцтвы» не нададуць яму жыццёвай сілы.

ВЯЛІКАЕ месца ў дыскусіі заняла праблема акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства. Асаблівую ўвагу ў сваіх артыкулах аддалі ёй Я. Рамановіч, Л. Александроўская, Д. Арлоў, Ц. Сяргейчык, Б. Браганцаў, Г. Колас, А. Клімава, А. Асторына, Т. Бушко.

Калі не лічыць асобных сцэнічных удач, дык агульны ўзровень акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства за апошнія гады знізіўся і выклікае сур'ёзную трывогу. На сцэне мы часта бачым халоднае рамесніцтва, бяздушнае «выкананне» ролі, не загрэтае агнём усхваляванай творчасці. Калісьці знойдзеныя прыёмы і манеры ігры ў многіх акцёраў ператвараюцца ў штампы, майстэрства пераўвасаблення — у самапаўторы. Нярэдка можна ўбачыць на сцэне і элементарную прафесіянальную неахайнасць, калі акцёр або актрыса развучыліся выразна вымаўляць словы, не заяртаюць увагу на дыкцыю, нюансіроўку, не валодаюць пластыкай рухаў і інш.

Нельга не пагадзіцца з думкай Б. Браганцава, што многія акцёры яшчэ не ў поўнай меры адчуваюць грамадзянскую адказнасць, слаба ўсведамляюць сваю місію ўладара думак і пачуццяў. Многа, занадта многа з'яўляецца раўнадушна выкананых роляў, якія не ўзрушаюць гледача.

Беспадстаўнымі можна лічыць спрэчкі адносна таго, хто ж «галоўны» ў тэатры — акцёр або рэжысёр, драматург ці мастак. Галоўны кожны з іх — удзельнік адзінага і складанага творчага працэсу, які завецца сцэнічным мастацтвам. Адзіным і «сапраўдным уладаром можа быць Тэатр — увесь, з усімі шматлікімі сродкамі сцэнічнай выразнасці, якія падпарадкаваны рэжысёрам ідэйна-мастацкаму вобразу спектакля», — слушна сцвярджае Г. Колас у сваім артыкуле «Усмешка Хафра і песеі Урані». І калі занядбаны які-небудзь адзін з кам-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

КРАСАМОЎНЫЯ ЛІЧБЫ

Гартаючы пажоўклы ад часу камплект газеты «Заря коммунизма» (орган Палітаддзела былой Воранаўскай МТС), у нумары за 10 чэрвеня 1950 года мы звярнулі ўвагу на маленькую заметку «Кіно ў калгасах». Вось што ў ёй паведамлялася:

«У калгасах і вёсках Воранаўскага раёна толькі з пачатку бягучага года прадэманстравана 185 кінасеансаў. Іх наведалі некалькі тысяч калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў. Вялікай папулярнасцю ў гледачоў карыстаюцца кінафільмы «Ул. І. Ленін», «Барацьба за мір» і іншыя».

З таго часу мінула 12 год. За гэты час кіно знайшло яшчэ больш шырокую дарогу да масавага гледача. Мастацкія, храніклальна- дакументальныя навукова-папулярныя і сельскагаспадарчыя фільмы глядзяць цяпер сельскія працаўнікі самых далёкіх населеных пунктаў раёна. За пяць месяцаў бягучага года на раёну прадэманстравана больш 4-х тысяч кінасеансаў, на якіх прысутнічалі звыш 125 тысяч гледачоў. У сельскай мясцовасці за гэты час адбылося 3 703 кінасеансы.

Лічбы гавораць самі за сябе. За 12 год колькасць кінасеансаў у сельскай мясцовасці Воранаўскага раёна павялічылася ў 20 разоў.

М. ЖУКАЎ.

ЭКСПЕДЫЦЫІ АРХЕАЛАГАЎ

З глыбіні стагоддзяў данёс да нашых дзён старажытны Полацк сваю былую веліч і высокую культуру. Аб гэтым сведчаць знойдзеныя пры археалагічных раскопках шматлікія рачы хатняга ўжытку. Так, напрыклад, на адным з паселішчаў, якое адносіцца да XII — XIII стагоддзяў, былі знойдзены прылады шавецкага рамяства і ліцейна-ювелірнай вытворчасці, ускрыты вельмі цікавыя дрэнажныя збудаванні.

Археалагічныя работы на тэрыторыі полацкага крамля будуць працягнуты і ў гэтым сезоне. Сюды выехала група археолагаў Інстытута гісторыі АН БССР. У пошуках новых дадзеных аб развіцці рамяства, быту і культуры групе давядзецца даследаваць плошчу ў 320 квадратных метраў.

Другі атрад будзе весці раскопкі ранніх славянскіх помнікаў культуры ў Гомельскай вобласці. У вёсцы Адамаўка Магілёўскай вобласці навуковыя работнікі займуцца даследаваннем рэштак паселішчаў і пахавальных збудаванняў.

Тэма трэцяй экспедыцыі — басейн ракі Прыпяць.

У археалагічных экспедыцыях гэтага года будзе ўдзельнічаць дзевяць груп.

Э. РЫСАЕЎ.

ПРА МІР І ДРУЖБУ

Некалькі дзён назад народная харавая капэла клуба чыгуначнікаў Брэсцкага вузла вярнулася з далёкай паездкі. Разам з іншымі калектывамі Брэсцкай вобласці капэла наведала братнюю Украіну і выступіла перад працоўнымі Ковеля, Луцка, Новавалынска. Цёпла сустрэлі украінскія гледачы самадзейных артыстаў і пажадалі ім творчых поспехаў. Для спевакоў гэта было самае прыемнае пажаданне. Справа ў тым, што ўсе ўдзельнікі харавой капэлы — а іх 85 чалавек—дзейсна рыхтуюцца да дэкады. Рэгулярна праводзяцца рэпетыцыі, на якіх развучваюцца новыя песні савецкіх кампазітараў. Ёсць сярод іх такія, што стала ўвайшлі ў рэпертуар хору. Гэта— «Зорка Венера», «Чыя звонкая песня», «Адвечная мара», «Свет ты наш, Верхавіна» і іншыя.

Новыя песні беларускіх аўтараў развучваюць салісты Р. Сакалоўская, Г. Назарук, В. Лейчык. Гэта песні аб міры, аб дружбе і працы савецкіх людзей.

ПІСЬМЕННІКІ Ў КУЛЬТАСВЕТРАБОТНІКАЎ

У Рагачове адбылася міжраённая нарада культасветработнікаў, на якой загадчыкі бібліятэк абмяняліся вопытам. На гэтую нараду былі запрошаны пісьменнікі П. Пестрак, А. Махнач, Е. Лось, С. Гаўрусёў, чытальнік А. Слесарэнка. У раённым Доме культуры адбыўся вялікі літаратурны вечар, які культасветработнікі і газеты прысвяцілі 80-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы. Кароткае ўступнае слова зрабіў А. Махнач. Свае вершы прачыталі П. Пестрак, Е. Лось і С. Гаўрусёў. Затым А. Слесарэнка чытаў творы Я. Купалы.

НА СЦЭНЕ НАРОДНЫХ ТЭАТРАЎ

23 народныя тэатры працуюць у нашай рэспубліцы. Чым жывуць самадзейныя калектывы?

Пра творчыя справы некаторых народных тэатраў расказваецца ў гэтай хроніцы.

У РЭПЕРТУАРЫ— БЕЛАРУСКІЯ П'ЕСЫ

— Хутка мы пакажам сваю новую работу — п'есу «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела, — паведамляе ў рэдакцыю па тэлефоне галоўны рэжысёр Ашмянскага народнага тэатра П. Дакуна. — Над п'есай самадзейныя артысты працуюць з вялікай ахвотай.

Чакаюць гэты спектакль і ашмянцы. Яны з цікавасцю глядзяць п'есы, прысвечаныя мінуламу і сучаснаму жыццю роднай рэспублікі.

Рэпертуар Ашмянскага народнага тэатра складаецца ў асноўным з п'ес беларускіх драматургаў. Спектаклі, паставленыя па гэтых п'есах, карыстаюцца поспехам. «Паўлінка» Я. Купалы прайшла на сцэне ўжо 35 разоў. Камедыю «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка, «На крутым павароце» К. Губарэвіча, «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага, «Позняе каханне» А. Астроўскага, «Разлом» Б. Лаўранёва, «Кухарка» А. Сафронава, «Родная маці» М. Алтухова і многа іншых. У народным тэатры ўдзельнічаюць рабочыя і служачыя аўтазавода — усяго 38 чалавек. Зараз рыхтуецца пастаноўка «Першы сустрэчны» Ю. Прынцава. На здымку: галоўны рэжысёр тэатра заслужаны артыст Казахскай ССР К. Арбенін (справа) праводзіць рэпетыцыю з артыстамі тэатра канструктарам Людмілай Галавань і слесарам Уладзімірам Самайловічам.

З поспехам выступаюць артысты народнага тэатра клуба Мінскага аўтамабільнага завода. Яны частыя госці раённых цэнтраў і калгасаў рэспублікі. За 15 год існавання тэатр паставіў спектаклі: «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка, «На крутым павароце» К. Губарэвіча, «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага, «Позняе каханне» А. Астроўскага, «Разлом» Б. Лаўранёва, «Кухарка» А. Сафронава, «Родная маці» М. Алтухова і многа іншых. У народным тэатры ўдзельнічаюць рабочыя і служачыя аўтазавода — усяго 38 чалавек. Зараз рыхтуецца пастаноўка «Першы сустрэчны» Ю. Прынцава. На здымку: галоўны рэжысёр тэатра заслужаны артыст Казахскай ССР К. Арбенін (справа) праводзіць рэпетыцыю з артыстамі тэатра канструктарам Людмілай Галавань і слесарам Уладзімірам Самайловічам.

Фота Ул. КРУКА.

У АРШАНЦАЎ

У чэрвені мінулага года драматычнаму гуртку Аршанскага ільнокамбіната было прысвоена званне Народнага тэатра. За год умацаваўся і ўзмужнеў малады калектыў. Спектаклі самадзейных артыстаў карыстаюцца вялікім поспехам. Нядаўна тут адбылася прэм'ера спектакля «Іркуцкая гісторыя» па п'есе А. Арбузава. Цяпер артысты рэпетыруюць п'есу «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна.

Плённа працуюць самадзейныя артысты народнага тэатра клуба чыгуначнікаў. У рэпертуары гэтага калектыву — 20 п'ес беларускіх і рускіх аўтараў.

Калектыў народнага тэатра аказвае творчую дапамогу драматычнаму гуртку завода швейных машын. Самадзейныя артысты абменьваюцца вопытам сцэнічнага майстэрства.

60 спектакляў

— Над якім спектаклем працуе калектыў тэатра? — з такім пытаннем звярнуліся мы да загадчыка пастановачнай часткі Пінскага народнага тэатра М. Літвіновіча. Нам адказалі:

— Самадзейных артыстаў зацікавіла п'еса «Чамадан з наклейкамі» Д. Угрумава. Адначасова працягваем работу над п'есамі «Затрыман на вуліцы» К. Фіна, «Сады цвітуць» В. Маса і Н. Кулінчанкі. У спектаклях удзельнічаюць лепшыя артысты народнага тэатра — радыст Мікалай Болтнаў, пенсіянер Аляксей Лобаў, студэнты Міхась Яўдасін, Ала Сакольская і іншыя. Нядаўна тэатр паказаў свой шасцідзесяты спектакль.

ГЛЕДАЧЫ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ

Апусцілася заслона. Змоўкі апладысменты, якімі ўзнагародзілі гледачы г. Барысава ўдзельнікаў спектакля «Свеціць ды не грэе» А. Астроўскага. Але ніхто не пакідае глядзельную залу. Адразу ж пасля прэм'еры адбылося абмеркаванне пастаноўкі. І нягледзячы на тое, што спектакль удаўся аматарам самадзейнай сцэны, у гледачоў было многа цікавых і слушных заўваг. Гледачы В. Белтаў, П. Іваноў гаварылі пра творчыя ўдачы народных артыстаў Л. Жалезняковай, С. Мірзаяна, А. Берікмана і інш., выказвалі пажаданні па асобных мізансцэнах і афармленні спектакля. Затым выступіў рэжысёр тэатра Ф. Міхайлаў. Ён расказаў, як ажыццяўлялася пастаноўка п'есы.

Гэта абмеркаванне адбылося нядаўна ў Барысаўскім народным тэатры. Яно не першае. Некалькі месяцаў назад аматары сцэны паказалі сваім гледачам спектакль «Дрэвы паміраюць стоячы». Тады таксама гледачы і артысты абмяркоўвалі пастаноўку.

Тэатр рыхтуе новы спектакль «І зноў бой».

АПОШНІЯ РЭПЕТЫЦЫІ

На сцэне Багушэўскага народнага тэатра праходзяць апошнія рэпетыцыі спектакля «Дзеля сваіх блізкіх» В. Лаўрэнцьева. У бліжайшы час адбудзецца прэм'ера.

Днямі артысты абмяркоўвалі план далейшай работы. Многія артысты пазнаёміліся з новай п'есай А. Маўзона «Пад адным небам». Яна падабаецца аматарам сцэны. Вырашана ўключыць п'есу ў рэпертуар тэатра.

Для тэлегледачоў

Днямі Рэчыцкі народны тэатр быў запрошаны ў Гомель для выступлення па тэлебачанню. Гледачам абласнога цэнтра быў паказаны спектакль «Маці сваіх дзяцей» А. Афінагенава.

ПРЫКЛАД, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ

Віктар БАРСАЎ,
спец. карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва»

У Горкім адбыўся першы фестываль «Сучасная музыка», Якая была цікавасць да яго, я даведаўся яшчэ па дарозе ў гэты горад на Волзе. Дзяўчына-дыспетчар аэрапорта ў Маскве на маё пытанне, ці ёсць білеты на самалёт да Горкага, адказала, што на бліжэйшыя дні ўсе білеты прададзены, і тут жа з дакорам дадала: «Хіба вы не ведаеце, што там цяпер адбываецца музычны фестываль?» А што гэта такое, я ачуў, калі мне ўсё ж удалося дабрацца да Горкага. У волжскім горадзе не было, бадай, ніводнага чалавека, абыякавага ў гэтыя дні да музыкі. Многія слухачы прыехалі з іншых куткоў краіны. Сярод іх былі не толькі прафесіянальныя музыканты, а і проста аматары.

У фае канцэртнай залы была наладжана цікавая выстаўка, якая знаёміла з поспехамі гаспадароў урачыстасцей — калектыву Горкаўскай філармоніі. Тут жа прадаваліся і кутка раскупляліся ноты, пласцінкі з запісамі твораў кампазітараў, што прыехалі для ўдзелу ў фестывалі.

Адным словам, усё было так, як і павінна было быць на вялікім музычным свяце. У фестывалі ўдзельнічалі выдатныя савецкія кампазітары — Д. Шастаковіч, Д. Кабалеўскі, А. Хачатуран, Ц. Хрэннікаў, выдатныя артысты Г. Вішнеўская, М. Растраповіч, Я. Флёер, лаўрэаты першых прэмій Другога Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага — віяланчалістка Н. Шахаўская і скрыпач Б. Гутнікаў, дыпламант гэтага ж конкурсу піяністка Л. Пячэрская, саліст Тэатра імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі Г. Дудараў, саліст аркестра Вялікага тэатра, валтарніст В. Полех, сімфанічны аркестр Маскоўскай філармоніі пад кіраўніцтвам К. Кандрашына, аркестр Горкаўскай філармоніі на чале з галоўным дырыжорам І. Гусманам.

Фестываль адкрыўся ўступным словам Ц. Хрэннікава і выкананнем «Урачыстага прэлюда», спецыяльна напісанага да гэтага свята горкаўскім кампазітарам А. Несцеравым. Здавалася, усе ўдзельнікі фестывалю аддалі яму ўвесь свой талент, запал свайго сэрца, вялікую любоў да музыкі нашых дзён. У ролі дырыжораў выступалі А. Хачатуран і Д. Кабалеўскі, Апошні разам з М. Растраповічам сыграў сваю санату для віяланчэлі і фартэпіяна — твор напісаны ўсяго тры месяцы назад і прысвечаны М. Растраповічу. Гэты палымяны прапагандыст сучаснай музыкі быў сапраўды нястомны. Ён іграў амаль ва ўсіх канцэртах не толькі як віяланчаліст-віртуоз, але і як выдатны піяніст, які акампаніраваў спявачцы Г. Вішнеўскай. Удзельнічаў ён і ў выкананні Восьмага квартэта Д. Шастаковіча, праявіўшы сябе выдатным ансамблістам. У выкананні гэтага твора прынялі таксама ўдзел Б. Гутнікаў і артысты аркестра Горкаўскай філармоніі Г. Афанасьеў і С. Блофарб. Яшчэ раз аб'ядналіся гаркаўчане і масквічы, калі ў суправаджэнні арыі з «Бразільскай Бахіяны» Віла-Лабаса, выдатна праспяванай Г. Вішнеўскай, удзельнічалі М. Растраповіч, Н. Шахаўская і ўся група віяланчалістаў мясцовага аркестра.

Цудоўным піяністам-віртуозам аказаўся Ц. Хрэннікаў, які выканаў свой фартэпіянны канцэрт у суправаджэнні сімфанічнага аркестра Горкаўскай філармоніі. Гэты аркестр праявіў сябе як калектыў высока-прафесіянальны, які іграе дынамічна, тэмпераментна, з захапленнем. Тут вялікая заслуга мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора І. Гусмана, які з'яўляўся душою свята. Уласна кажучы, вялікія дасягненні гэтага калектыву і дазволілі ініцыятарам і арганізатарам фестывалю М. Растраповічу, І. Гусману, дырэктару Горкаўскай філармоніі Г. Нікіціну задумаць і здзейсніць свой выдатны план.

Радаснай была сустрэча гаркаўчан з усеагульным любімцам савецкай публікі, амерыканскім піяністам Ванам Кліберном, які сыграў у адзін з вечароў фестывалю Трэці канцэрт для фартэпіяна з аркестрам С. Пракоф'ева. Мне пашанцавала гутарыць з нашым амерыканскім сябрам. На праграме фестывальных канцэртаў Ван Кліберн напісаў прывітанне беларускім аматарам музыкі:

«Да ўсіх маіх сяброў у Мінску! Шлю самыя цёплыя пажаданні і спадзяюся яшчэ сустрэцца з Вамі. Я ніколі не забуду, як Вы натхнялі мяне ў час канцэртаў. Мая маці таксама далучаецца да лепшых Вам пажаданняў.

З прыязнасцю —
Ван Кліберн.

11. VI-62 г.».



Уражанні ад пачутай у Горкім музыкі такія вялікія і разнастайныя, што не так лёгка вылучыць з іх самае значнае. Адной з найбольш яркіх падзей фестывалю было выкананне Чацвёртай сімфоніі Д. Шастаковіча, прэм'ера якой незадоўга да гэтага адбылася ў Маскве, праз чвэртку стагоддзя пасля напісання гэтага твора. Слухачы стоячы віталі ўсхваляванага аўтара. Цёпла прымаліся і ўрыўкі з оперы Д. Шастаковіча «Ледзі Макбет Мцэнскага павета». Дзве арыі Кацярыны Ізмайлавай у цудоўным выкананні Г. Вішнеўскай і чатыры оперныя антракты, сыграныя горкаўскім аркестрам, пераконваюць у тым, што гэтая опера валодае вялікай сілай уражання. З'едлівым сатырыкам з'явіўся Д. Шастаковіч перад слухачамі і ў сваім вакальным цыкле «Карцінкі мінулага» на словы Сашы Чорнага, з вялікай тонкасцю і майстэрствам выкананым Г. Вішнеўскай і М. Растраповічам.

Творчасць іншых савецкіх кампазітараў была прадстаўлена на фестывалі Санатай № 2 для скрыпкі і фартэпіяна і сімфоніяй-канцэртам для віяланчэлі з аркестрам С. Пракоф'ева, Патэтычнай уверцюрай і віяланчэльнай санатай Д. Кабалеўскага, скрыпічным і фартэпіянным канцэртамі А. Хачатурана, канцэртам для фартэпіяна і ўрыўкамі з музыкі да спектакля «Многа шуму з нічога» Ц. Хрэннікава, фрагментамі з балета «Сцежкаю грому» К. Караева. Усе гэтыя творы знаходзілі жывы водгук у гаркаўчан.

Гучала ў дні фестывалю і музыка зарубежных аўтараў. Вялікае ўражанне пакінуў праграмны твор венгерскага кампазітара Б. Бартака — канцэрт для аркестра. Вельмі цікавыя «Метамарфозы» Хіндэміта, у якіх з вялікім майстэрствам і дасціпнасцю робяцца варыяцыйныя распрацоўкі тэмы Вэбера. Былі выкананы чатыры марскія інтэрмедыі з оперы «Пітэр Граймс» прагрэсіўнага англійскага кампазітара Бенджаміна Брытэна, урыўкі з аркестравай сюіты «Дрэздэнская галерэя» Герстэра (ГДР), фрагмент з балета «Жар-птушка» І. Стравінскага.

Значэнне першага фестывалю «Сучасная музыка» цяжка пераацаніць.

Прызнацца, я нават зайздросціў горкаўскім аматарам мастацтва, таму што знаёмства з канцэртным жыццём волжскага горада на працягу некалькіх сезонаў прымусіла прыйсці да вываду, што там яно больш цікавае і змястоўнае, чым у Мінску. Многае з таго, што ўжо даўно гучала не толькі ў Горкім, але і ў многіх іншых гарадах краіны, у нас у Беларусі не выконвалася яшчэ ні разу. Так, мінчане да гэтага часу не пазнаёміліся ў жывым гучанні з Дванаццатай сімфоніяй Шастаковіча, многімі творамі Пракоф'ева, творчасцю цэлага раду маладых савецкіх кампазітараў. Не чуем мы твораў кампазітараў братніх рэспублік, не ведаем лепшых узораў зарубежнай музыкі XX стагоддзя.

Рэдкасцю сталі ў нас выступленні квартэтаў і іншых інструментальных ансамбляў. Вялізная скарбніца цудоўнага — камерная музыка з'яўляецца для мінчан «тайнай за сямю пячаткамі».

Трэба шчыра сказаць, што за апошнія два сезоны інтэнсіўнасць канцэртнага жыцця ў Мінску намнога знізілася як у колькасных, так і ў якасных адносінах, і ў сэнсе разнастайнасці выконваемых праграм. У нас не да канца выкарыстоўваюцца наяўныя магчымасці. Чаму, скажам, у тым жа Горкім можна часта пачуць у канцэртах кансерваторскія калектывы, харавую капэлу хлопчыкаў, а ў Мінску — не? Дарэчы, нягледзячы на шматгадовыя клопаты народнага артыста СССР Р. Шырмы, у нас да гэтага часу не могуць адкрыць харавога вучылішча і на яго базе стварыць хор хлопчыкаў. Недапушчальна мала прыцягваецца да ўдзелу ў філарманічных канцэртах такі выдатны калектыў, як Акадэмічная харавая капэла.

Неяк у Ленінградзе мне давялося прысутнічаць на вечары сучаснай музыкі, напісанай для невялікіх складаў аркестравых інструментаў. У праграму ўваходзілі творы Пракоф'ева, Уствольскай, Мійё, Стравінскага. Выканаўцамі выступалі музыканты-салісты Ленінградскага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Г. Раждзественскага. І тут я падумаў: Дзяржаўны ж сімфанічны аркестр БССР таксама мае выдатных вопытных выканаўцаў — скрыпачоў, альтыстаў, віяланчалістаў, габаістаў і г. д. Хіба яны не маглі б выступаць з паказам твораў для малых складаў, тым больш, што ў сучаснай музыцы можна знайсці мноства цудоўных узораў такіх твораў?

Сама арганізацыя і правядзенне канцэртных сезонаў, прапаганда сучаснай, перш за ўсё савецкай музыкі ў Беларусі ніяк не можа нас задаволіць. У Горкім, напрыклад, у мінулым сезоне было выпушчана шэсць абанементаў, і ўсе яны былі паспяхова рэалізаваны. А ў нас існаваў толькі адзін абанемент, прысвечаны творчасці Бетховена, і то ён прынёс кіраўнікам філармоніі нямала клопатаў і хваляванняў. Забыта такая цікавая і карысная форма папулярызацыі сучаснай музыкі, як аўтарскія канцэрты. У Мінску ўвогуле амаль ніколі іх не бывае.

Чамусьці так павялося ўжо, што калі ў Савецкі Саюз прыязджаюць на гастролі выдатныя прадстаўнікі зарубежнага мастацтва — асобныя выканаўцы і калектывы — дык звусёды яны выступаюць толькі ў Маскве, Ленінградзе і Кіеве. У беларускай жа сталіцы музыканты-гастралёры — рэдкія госці. Такое ненармальнае становішча павінна быць ліквідавана, і кут павінна сказаць сваё важкае слова Міністэрства культуры БССР.

Ва ўжытку канцэртных арганізацый існуюць такія паняцці: «добрая публіка» і «дрэнная публіка». «Добрая» — тая, якая з цікавасцю слухае канцэрт сур'ёзнай музыкі; «дрэнная», маўляў, цікавіцца толькі эстрадай, джазам, танцамі. Але гэтыя паняцці не адлюстроўваюць сапраўднага становішча справы. Можна гаварыць толькі пра больш ці менш падрыхтаваных слухачоў, якія не вінаваты ў тым, што адсталі ў сваім эстэтычным развіцці. Затое гаворку трэба весці пра добрых і дрэнных кіраўнікоў музычных устаноў, якія павінны адказваць за «дрэнную», непадрыхтаваную публіку. У некаторай ступені мы, выканаўцы, самі вінаваты, што добрая, змястоўная музыка, у тым ліку сучасная, яшчэ мала даходзіць да шырокіх народных мас. Бо звычайна, выязджаючы на канцэрт у рабочы ці сельскі клуб, мы стараемся «аблегчыць» праграму, скласці яе з папулярных твораў. Але, калі заўсёды ў такіх канцэртах іграць, скажам, «Танец маленькіх лебедзяў» Чайкоўскага, дык калі ж слухачы пазнаюць і палюбяць сучасную музыку?

У той жа час, напрыклад, у дні Горкаўскага фестывалю аркестр Маскоўскай філармоніі, выступаючы разам з Ванам Кліберном у Палацы культуры аўтазавода (дарэчы, гэта было першае выступленне амерыканскага піяніста перад рабочай аўдыторыяй), уключыў у праграму канцэрта «Сімфанічныя танцы» Рахманінава, Трэці фартэпіянны канцэрт Пракоф'ева, сюіту з балета Равеля «Дафніс і Хлоя». І шматлікія слухачы-рабочыя вельмі добра ўспрымалі сучасную музыку, таму што аказаліся падрыхтаванымі да яе.

Як гэта ні парадаксальна, але вялікую шкоду справе музычнага выхавання народа часта наносяць тыя, хто абавязаны па роду сваёй дзейнасці быць больш за ўсё зацікаўленым у эстэтычным выхаванні слухачоў. Я маю на ўвазе некаторых кіраўнікоў палацаў культуры і клубаў, якія свае дрэнныя асабістыя густы выдаюць за адсутнасць цікавасці ў публікі да сур'ёзнага мастацтва. Яны ніколі не наладжваюць (ці робяць гэта вельмі неахвотна) у сваіх залах змястоўных акадэмічных канцэртаў, абмяжоўваючыся эстраднымі паказамі любой якасці. Відавочна, трэба правесці вялікую растлумачальную работу з такімі клубнымі кіраўнікамі. Ім трэба нагадаць, што пры ўсёй неабходнасці захавання фінансавых інтарэсаў, галоўнае — гэта эстэтычнае выхаванне людзей.

Гаворачы пра мінскіх слухачоў, я ніяк не магу падумаць, што яны горшыя за ленінградскіх ці горкаўскіх. Аднак у нашым горадзе публіка не зусім падрыхтавана да ўспрыняцця сучаснай музыкі, ды і не ўсе канцэрты з твораў класікаў яшчэ добра наведваюцца. Чамусьці лічыцца, што лепш за ўсё слухаюць у нас піяністаў, горш — скрыпачоў, яшчэ горш — віяланчалістаў. Але вось, напрыклад, нядаўна ў Мінску выступаў лаўрэат Другога Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага Б. Гутнікаў. Зала была перапоўнена. А некалькі раней той жа скрыпач іграў у нашым горадзе пры амаль пустой зале, хоць і да творчага спаборніцтва ў Маскве ён быў выдатным майстрам, лаўрэатам трох міжнародных конкурсаў. Значыць, справа не ў тым, на якім інструменце іграе саліст-гастралёр, а ў арганізацыі канцэрта, ва ўменні абудзіць у людзей цікавасць да выканаўца і да самой праграмы, наладзіць добрую шырокавяшчальную рэкламу.

Пра адну катэгорыю нашых слухачоў варта сказаць асобна. Я маю на ўвазе студэнтаў Беларускай кансерваторыі і Мінскага музычнага вучылішча, старшакласнікаў музычнай школы-адзінаццацігодкі. Будучыя музыканты абавязаны рэгулярна наведваць канцэрты, узбагачаць сябе музычнымі ўражаннямі. Аднак пераважная большасць маладых, пачынаючых музыкантаў на канцэртах не бывае і іх веды ў галіне будучай прафесіі з-за гэтага значна абмяжоўваюцца. У вучняў музычных навучальных устаноў трэба выхоўваць неабходнасць наведвання канцэртаў. Зрэшты, пачынаць, відаць, варта з педагогаў, таму што некаторыя з іх таксама радка бываюць на музычных вечарах.

Я вярнуўся з Горкага з пачуццём вялікага задавальнення ад усяго пачутага і ўбачанага. І з вельмі вялікім жаданнем, каб горадам другога фестывалю «Сучасная музыка» стала сталіца Беларусі, наш цудоўны Мінск.

ФІЛЬМЫ АБ МОЛАДЗІ

24 чэрвеня працоўныя нашай краіны адзначаюць Дзень савецкай моладзі. У сувязі з гэтай знамянальнай датай на многіх гарадскіх і сельскіх кінаўстаноўках рэспублікі шырока паказваюцца кінафільмы, якія расказваюць пра гераічныя шляхі нашай моладзі.

З вялікай цікавасцю прагледзяць гледачы мастацкія кінакарціны «Павел Карчагін», «Дабраахвотнікі», «Выпрабавальны тэрмін», «Камсамольск», «Пакаленне пераможцаў», «Трывожная маладосць», «Вясна на Зарачнай вуліцы», «Народжаныя бурай», «Пазт», «Жорсткасць», «Чакайце пісьмаў», «Кар'ера Дзімы Горына», «Ім было па дзевятнаццаць» і шмат іншых.

Аб гераізме юнакоў і дзяўчат у гады Вялікай Айчыннай вайны расказваюць кінафільмы «Балада пра салдата», «Два байцы», «Крэпасць на колах», «Подзвіг разведчыка», «Чыстае неба», «Апошнія залпы». Добрым справам моладзі на цаліне прысвечаны кінакарціны «Неспакойная вясна», «Першы эшалон», «Вярозы ў стэпу», «Іван Броўкін на цаліне», «Гарызонт».

Шмат цікавага расказваюць пра моладзь новыя хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя фільмы.

ПА ЗАПРАШЭННЮ СЯБРОЎ З ЛІТВЫ

Для ўдзелу ў свяце дружбы народаў, якое праводзіцца ў Літве, выехаў Лідскі аб'яднаны ансамбль песні і танца.

Аматарскі калектыў быў створан год таму назад з ліку лепшых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Ансамбль узначаліў дэмабілізаваны афіцэр Савецкай Арміі, былы капельмайстар В. Аламаха.

У праграме самадзейных артыстаў — песні і танцы народаў нашай краіны, а таксама некаторыя песні, напісаныя кіраўніком ансамбля. Найбольшай папулярнасцю сярод іх карыстаюцца «Радзіма», «Вярозка».

Выйшлі з друку

У Дзяржаўным выдавецтве Беларусі выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай літаратуры:

Якуб Колас. Збор твораў у дванаццаці тамах. Том 5. Апавяданні паслякастрычніцкага перыяду, «Казкі жыцця», народныя казкі ў апрацоўцы Я. Коласа. Падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі І. Крэнь і К. Піліповіч. Мастак Е. Клікушын. Тыраж 3 100 экз., стар. 720. Цана 1 руб. 26 кап.

Іван Новікаў. Руіны страляюць ва ўпор. Дакументальная аповесць. Мастак П. Драчоў. Тыраж 9 тыс. экз., стар. 436. Цана 75 кап.

Міхаіл Плотнікаў. Пагранічныя сцежкі. Вершы. На рускай мове. Мастак В. Філіпенка. Тыраж 2 500 экз., стар. 60. Цана 7 кап.

Аляксандр Мінкоўскі. Ніколі ў жыцці. Аповесць. Пераклад з польскай мовы К. Паўтаржыцкага. Мастак П. Драчоў. Тыраж 3 тыс. экз., стар. 172. Цана 19 кап.

ТРЫБУНА ВЫСОКІХ ДУМАК, ВЯЛІКІХ ПАЧУЦЦЯЎ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

панентаў гэтага творчага працэсу, гэта адбіваецца на ўсіх галінах сцэнічнага мастацтва.

Дыскусія выявіла сур'ёзнае адставанне сучаснай беларускай рэжысуры. Пра яе стан з вялікай трывогай гаварылі многія аўтары.

На сумесным пасяджэнні мастацкага савета Міністэрства культуры БССР, прэзідыума Саюза пісьменнікаў і прэзідыума БТА ражысёр Б. Дакутовіч вельмі правільна паставіў пытанне аб тым, што ў тэатрах не створаны ўмовы для прафесіянальнай трэніроўкі акцёраў. Няма педагогаў, якія сістэматычна займаліся б з акцёрамі шліфоўкай голасу, рухаў, пластыкі. Ды і самі акцёры рэдка самастойна займаюцца ўдасканаленнем сваёй тэхнікі і майстэрства наогул.

Неабходна, відаць, ужыць адміністрацыйныя захады, каб стварыць у тэатрах належныя ўмовы для прафесіянальнага росту акцёраў.

Правільна пісалі акцёры Тэатра імя Я. Коласа А. Мілаванаў і І. Нагаўкін у артыкуле «Вытворчасць ці мастацтва», што прафесіянальнаму росту маладых акцёраў часта замінае залішняя перагрузка, калі ледзь не штодзень даводзіцца іграць у спектаклях і рэпеціраваць новыя пастаноўкі.

Справа тут, відаць, залежыць ад правільна складзенага рэпертуару. Вядома, што за апошні час з'явілася шмат так званых «маладзёжных» п'ес, дзе амаль усе галоўныя героі — моладзь. Тэатры ахвотна ставяць гэтыя п'есы таму, што такія спектаклі падабаюцца гледачам і даюць поўную нагрузку маладым акцёрам.

Але на практыцы атрымліваецца не «загрузка», а перагрузка моладзі ў той час, як многія старэйшыя майстры месяцамі, а то і больш чакаюць сваёй ролі. Гэта можна сказаць, напрыклад, пра купалаўскі тэатр, дзе гледачы рэдка бачаць на сцэне Л. Ржацкую, В. Галіну, В. Пола, Ул. Дзядзюшку, Г. Глебава, С. Станюту і іншых сваіх любімых акцёраў.

У тэатрах яшчэ не навучыліся планаваць рэпертуар так, каб была занята ўся трупа, а не частка яе. Пры цяперашнім планаванні, акрамя ўсяго іншага, парушаецца традыцыя творчай пераемнасці, калі маладыя акцёры, выступаючы ў спектаклі разам з майстрамі, не практыцы засвойвалі б іх сцэнічны вопыт.

І тут ёсць над чым задумацца тэатральным кіраўнікам, асабліва — галоўным ражысёрам, калі яны хочуць дамагчыся ансамблевасці спектакляў і правільна выхоўваць маладыя таленты ў сваіх калектывах.

Зразумела, многае залежыць і ад саміх маладых акцёраў. Некаторыя з іх захапляюцца свае́мі першымі сціплымі поспехамі, памылкова думаючы, што яны ўжо ўсё ведаюць, што цяпер ім «мора па калена», не прыслухоўваюцца да крытыкі і заўваг старэйшых таварышаў. Такіх «геніяў», як паказала жыццё, хапае на два-тры сезоны, пакуль абаяльнасць маладосці яшчэ здольна падмяняць майстэрства, а пасля на сцэне застаецца шэрая пасрэднасць сярэдняга ўзросту.

Надзвычай карысна было б кожнаму маладому акцёру прыслухацца да парады старэйшай актрысы Брэсцкага тэатра А. Асторынай, якая ў сваім артыкуле «Слова да моладзі» піша: «Чалавек, які прысвяціў сябе тэатру, павінен перш за ўсё ахвяраваць сваім спакоем. Заўсёды шукаць! Быць заўсёды дапытлівым, назіральным! Заўсёды памятаць, што ты творца».

НА ЖАЛЬ, сама сістэма падрыхтоўкі маладых акцёраў не спрыяе папаўненню тэатраў сапраўды таленавітай і прафесіянальна ўзброенай моладдзю. Пачынаючы ўжо з самога набору студэнтаў у тэатральна-мастацкі інстытут і кансерваторыю, калі не шукаюць будучых акцёраў, а чакаюць іх «стыхійнага» з'яўлення, сістэма падрыхтоўкі не адпавядае сённяшнім патрабаванням. Уся праца ану, як вядома, шчыльна звязана цяпер з практыкай, з жыццём. Здавалася б, што тэатральна-мастацкі інстытут і кансерваторыя павінны былі перабудаваць сваю дзейнасць у гэтым напрамку. Але і сёння яны адарваны ад жывой творчай практыкі тэатраў. Студэнты інстытута і кансерваторыі не бываюць на рэпетыцыях у тэатрах, не бачаць акцёрскай і рэжысёрскай «кухні», амаль не ўдзельнічаюць у масоўках, карацей кажучы, яны адарваны ад жыцця, да якога рыхтуюцца.

Вельмі слушна прапануе Л. Александроўская, каб студэнты чацвёртых і пятых курсаў кансерваторыі праходзілі практыку ў оперным тэатры. Тое ж самае трэба сказаць і пра студэнтаў тэатральна-мастацкага інстытута, бо і тым, і другім нестае, як паветра, практычнай творчасці ў тэатральных калектывах. І правільна зазначалі ўдзельнікі дыскусіі, што з інстытута і кансерваторыі ў тэатры прыходзіць «сыры» матэрыял, з якога трэба яшчэ «ляпіць» сапраўдных акцёраў.

Адна з прычын такога становішча — тое, што інстытут і кансерваторыя падначалены Міністэрству вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі, а іх выпускнікоў выкарыстоўвае Міністэрства культуры. Апошняе не можа ўмешвацца ў арганізацыю навучальнага працэсу, каб перабудаваць яго адпаведна задачам, што стаяць сёння перад тэатральным мастацтвам, а Міністэрства адукацыі не адказвае за далейшы лёс сваіх выпускнікоў, бо па сканчэнні ву яны пераходзяць у другое «ведамства». І выходзіць, што ні тое, ні другое міністэрства не нясе з пачатку і да канца адказнасці за лёс людзей.

Зазначым, што ва ўсіх іншых рэспубліках мастацкія ву падначалены, як яно і павінна быць, толькі аднаму гаспадару — Міністэрству культуры.

Але нават пры належнай падрыхтоўцы акцёраў інстытут не можа задаволіць попыт усіх тэатраў рэспублікі, бо іх трэба больш, чым інстытут выпускае штогод. Таму, відаць, у ходзе абмеркавання праваамерна ўзнікла прапанова аб аднаўленні студый пры буйнейшых тэатрах рэспублікі. У свой час з такіх студый выйшлі многія вядомыя цяпер майстры купалаўскага і коласаўскага тэатраў. Вельмі слушна сказаў у сваім выступленні Л. Рахленка, што кожны тэатр, выходзячы са сваіх творчых пазіцый, ведаў бы, каго прымаць у сваю студыю; што ў драматычнай самадзейнасці ёсць шмат таленавітых людзей, якія па фармальных патрабаваннях не могуць быць прыняты ў тэатральны інстытут, а ў студыі яны могуць займацца.

Студыйцы, як правіла, займаюцца без адрыву ад сваёй асноўнай працы, значыць, у мастацтва яны прыходзяць не са школьнай парты, а з пэўным жыццёвым вопытам, якога нестае студэнтам тэатральнага інстытута. Нарэшце, студыі садзейнічалі б справе пераемнасці старэйшых і маладых пакаленняў акцёраў. Майстры сцэны штодзень і на свае вочы бачылі б будучых артыстаў, выбіралі б з іх найбольш блізкіх да сваіх творчых пазіцый і выхоўвалі б сабе змену.

ШМАТ творчых і арганізацыйных пытанняў тэатральнага жыцця рэспублікі ўзнікла ў дыскусіі, праведзенай нашай газетай. Многія з іх заслугоўваюць самай сур'ёзнай увагі з боку тэатраў, Міністэрства культуры, Саюза пісьменнікаў і БТА. І важна не толькі прызнаць іх сурёзнасць, а зрабіць практычныя вывады.

Зразумела, што ў адной дыскусіі нельга было з аднолькавай глыбінёй абмеркаваць усе праблемы тэатральнага мастацтва. Рэдакцыя спадзяецца, што ўвага актыву газеты да жыцця нашых тэатраў і надалей не будзе паслаблена. Праведзенае абмеркаванне мы лічым толькі пачаткам грунтоўнай размовы.

Рэдакцыя выказвае шчырую ўдзячнасць усім, хто прыняў удзел у дыскусіі, і запрашае майстроў мастацтва і чытачоў выступаць у газеце па надзённых і хвалюючых пытаннях беларускага тэатральнага жыцця.

МІКРАРАЁНАМ — БІБЛІЯТЭКІ

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

Масавыя і дзіцячыя бібліятэкі Мінска шукаюць новыя формы і метады прапаганды кнігі. Многае робяць, напрыклад, грамадскія бібліятэкі, створаныя пры домакіраўніцтвах. У Фрунзенскім раёне добра працуе грамадская бібліятэка пры домакіраўніцтве № 12. У гэтым раёне не было ніводнай дзіцячай бібліятэкі, а цяпер ёсць піянерская грамадская бібліятэка, якая мае ўжо амаль 300 пастаянных чытачоў. Такіх грамадскіх бібліятэк у Мінску 16. Створаны клубы аматараў музыкі, тэатра і кіно ў масавай бібліятэцы Ленінскага раёна, у гарадской імя Я. Купалы, у дзіцячай імя М. Астроўскага і іншых.

Работнікі бібліятэк Мінска выступаюць з цікавымі аглядамі навінак перад сеансамі ў кінатэатрах «Перамога», «Мір», «Цэнтральны», «Дзіцячы», «Зорка». Гэта дае станоўчыя вынікі. Толькі ў адной гарадской дзіцячай бібліятэцы колькасць чытачоў летась павялічылася на 256 чалавек.

Многія мінскія бібліятэкі ўключыліся ў рух за званне калектыву выдатнай працы. Гэтае высокае званне прысвоена ўжо бібліятэцы імя Гогаля.

Але ў рабоце прапагандыстаў кнігі ёсць яшчэ нямала перашкод. Вельмі дрэнна бібліятэкі забяспечваюцца літаратурай. Мала кніг на грамадска-палітычныя тэмы і па мастацтву атрымалі летась дзіцячыя бібліятэкі. Да гэтага часу Беларускае дзяржаўнае выдавецтва не выпусціла ў свет ніводнага плаката, які ў даступнай для дзяцей форме прапагандаваў бы Праграму КПСС.

У Мінску працуюць нямала бібліятэк розных ведамстваў — прафсаюзныя, школьныя, вышэйшых навучальных устаноў. Яны маюць багатыя кніжныя фонды, але ніхто з іх не клапоціцца пра тое, каб вынесці сваю дзейнасць за межы бібліятэкі — стварыць перасоўкі, пункты выдачы кнігі, грамадскія бібліятэкі пры домакіраўніцтвах і г. д.

І хвалюе яшчэ адно пытанне. Чамусьці ў новых мікрараёнах Мінска, у якіх жыве шмат тысяч жыхароў, не прадугледжаны памяшканні для бібліятэк. Архітэктары — аўтары планаў забудовы — улічылі будаўніцтва гаражоў для прыватных машын, а памяшканне для бібліятэкі не знайшлі патрэбным запланаваць.

Людзям патрэбна кніга. Было б мэтазгодна выдзеліць тарадскому Упраўленню культуры адзін-два аўтобусы, якія можна было б прыстасаваць пад бібліятэкі-перасоўкі. Яны абслугоўвалі б у пэўныя дні па чарзе жыхароў мікрараёнаў нашай сталіцы.

Х. ГАРАНОК,
загадчык гарадской дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага

У ВАРТАВЫХ РАДЗІМЫ

Не так даўно мне і майму сябру, мастаку М. Тарасінаву давялося быць у творчай камандзіроўцы ў пагранічнікаў БВА. Мы знаёміліся з мірнымі буднямі вартавых Радзімы. Адначасова самі расказвалі воінам пра беларускае выяўленчае мастацтва. Разам з намі з Дзяржаўнага мастацкага музея БССР была наніравана выстаўка.

Мы былі на заставе імя Віктара Усава, якая адна з першых прыняла на сябе ўдар фашысцкіх орд 22 чэрвеня 1941 года. Адважныя пагранічнікі доўгі час адбіваліся ад шматлікіх атак цэлага батальёна азвярэлых фашыстаў і загінулі ўсе, не скарыўшыся ворагу і не адступіўшы ні на крок. Ім пастаўлены помнік. На заставе усталявалася традыцыя: калі ідзе нарад на ахову дзяржаўнай граніцы, ён спыняецца ля помніка ў хвіліне маўчання, аддаючы пашану загінуўшым. Адзін з нас занатаваў на малюнку гэты ўрачысты эпізод.

Шмат хвалюючых уражанняў прынесла нам знаёмства з жыццём пагранічнікаў. Расказваць пра іх нам, мастакам, зручней не словамі, а малюнкам.

Ул. САКАЛОЎ,
мастак.



Хвіліна маўчання.

Раніца на заставе.

Дакладваю: на ўчастку ўсё спакойна!

Малюнкі Ул. САКАЛОВА.

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

ШЧЫРАЕ СЭРЦА ПЕСНЯРА

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ

★

У дні імперыялістычнай вайны, у канцы 1914 года, у Мінску быў створаны беларускі народны хор пад кіраўніцтвам Уладзіміра Тэраўскага. Удзельнікамі хору былі рабочыя друкарні, служачыя пошты і чыгункі, настаўнікі і вучні. Сярод іх пашчасліўіла быць і мне, васьмігадоваму хлапчуку.

Харысты, абутыя ў лапці, у пярэстай саматканай вопратцы, выступалі перад параненымі салдатамі ў шпіталях, давалі канцэрты для гарадскога насельніцтва, выязджалі ў мястэчкі, дзе, за адсутнасцю клубаў, прыстасоўвалі для канцэртаў пажарныя дэпо.

Пазней у праграму выступленняў хору пачалі ўводзіць дэкламацыю твораў беларускіх пісьменнікаў. Чыталі невялічкія жартоўныя апавяданні Тараса Гушчы (Якуба Коласа), вершы Янкі Купалы.

На ўсё жыццё я палюбіў беларускія народныя песні і вершы, якія ў гэтым хоры пачуў упершыню. Асабліва падабалася мне слухаць вершы. Яны захаплялі, кожны раз адкрывалі штосьці новае, і паступова, радок за радком, я іх запамінаў. Неўзабаве многія вершы Я. Купалы я ўжо ведаў напамяць.

Праз некаторы час мне выпала самому выступаць з дэкламацыяй верша Я. Купалы «Гэй, наперад!».

Колькі было дзіцячай радасці і хвалявання!

З уздымам, звонкім голасам я чытаў:

Гэй, наперад, покі сэрца
Б'ецца, рвецца на прастор.
Годзе млеці ў паняверцы,
Гэй, да сонца! Гэй, да зор!

У наступныя гады чытаць са сцэны вершы Янкі Купалы стала для мяне любімым заняткам.

Са шматлікіх вечароў-канцэртаў нашага хору мне добра запомніўся вечар, які адбыўся ў Мінску, у клубе пад назвай «Беларуская хатка».

Было гэта ў 1919 годзе.

Першыя дні стварэння Беларускай ССР. На грудзях у публікі і харыстаў ірдзелі чырвоныя стужкі, значкі з сярпом і молатам. Настрой узняты, урачысты. Раптам пранеслася чутка:

— Прыйшоў Янка Купала!

У зале доўга не сціхалі воплескі. Радасць сустрэчы з родным песняром надала вечару яшчэ большую святочнасць.

Працясняўшыся праз натоўп, які шчыльна абкружыў Купалу, я ўбачыў любімага паэта. На ім была белая сарочка, гальштук цёмна-чырвонага колеру, адкрыты суконны фрэнч з чатырма нашытымі зверху кішэнямі, штаны галіфэ, а замест ботаў жоўтыя гетры і чорныя чаравікі са шнуркамі.

Я быў вельмі здзіўлены тым, што Янка Купала гаварыў з людзьмі, як зусім просты чалавек, што, вітаючыся са сваімі знаёмымі, паціскаючы іх рукі, пачціва схіляў галаву.

Я адчуў нават нейкае расчараванне.

Мне, падлетку, здавалася, што той, хто стварае такія цудоўныя творы, у каго словы складаюцца так трапна і прыгожа, не павінен быць падобным да простых людзей. А перада мной быў просты, звычайны чалавек. Я тады яшчэ не разумеў, што ў гэтага простага, сціплага чалавека такое вялікае незвычайнае сэрца.

Пачаўся канцэрт.

Янка Купала з жонкай Уладзіславай Францаўнай, адзетай у беларускі нацыянальны касцюм, сядзелі ў першым радзе. Са сцэны я не зводзіў з яго сваіх дапытлівых вачай.

Загучала песня.

Я бачыў, як на твары паэта засяцілася радасная ўсмешка, як ён апладзіраваў і штораз — то ўсё больш і мацней. Выконваліся папулярныя ў той час народныя песні — «Чалавек жонку б'е», «Зязюля», «Вульба», «Што за месяц, што за ясны», а таксама песні, напісаныя Ул. Тэраўскім на словы Я. Купалы «Каля хацінкі», «Шумныя бярозы», «Жыў на свеце Лявон». Дэкламавалі вершы паэта «Маладая Беларусь», «Чаго вам хочацца, панове», «Гэй, наперад!».

Пасля нашага выступлення Янка Купала прыйшоў на сцэну. Віншаваў удзельнікаў хору з поспехам, з добрым канцэртам.

Відаць таму, што сярод удзельнікаў вечара я быў самы меншы, Я. Купала прыблізіў мяне да сябе, пагладзіў па галаве, спытаўся, як завуць, дзе вучуся, хто бацькі. Я разгубіўся і не мог вымавіць ніводнага слова. Аднак цеплыня яго ласкі надала смеласці. Я паступова разгаварыўся, нават паскардзіўся, што кніг з вершамі ў мяне няма, а чытаць вершы вельмі люблю. Янка Купала сказаў, каб я прыйшоў да яго на кватэру і ён дасць што-небудзь мне для чытання.

Назаўтра я ўжо стаяў на ганку ягонай кватэры. Жыў тады Іван Дамінікавіч на Захараўскай вуліцы ў доміку, у якім калісьці адбыўся І-шы з'езд РСДРП. Я нясмела пастукаў у дзверы. У сенцы выйшла Уладзіслава Францаўна, папрасіла мяне пачакаць, пасядзець трошкі на ганку. З хаты даносіліся галасы — відаць, там былі госці.

Седзячы на ганку, я разглядаў двор, дзе было шмат зеляніны і кветак.

Трэба сказаць, што Янка Купала вельмі любіў сад і кветкі. Дзе б ён ні жыў, заўсёды перад вокнамі яго кватэры быў агародчык, ён сам даглядаў кветкі, палоў і паліваў іх. Так было па Правіянскай вуліцы, так было і каля яго дома па вуліцы Крышчэнскай. Тут, на невялікай пляцоўцы, Іван Дамінікавіч развёў своеасаблівы батанічны сад. Вясной расцвіталі кусты буйналістага бэзу. На любоўна дагледжаных клумбах красаваліся разнастайныя кветкі і сярод іх узвышалася густая серабрыстая яліна. Купала выводзіў і новыя гатункі кветак. З любоўю садоўніка ён паказваў гасцям кусты цудоўных руж, не без гонару падкрэсліваючы, што вырасціў іх сам, прышчапіўшы да садовай ружы дзікую лясную шыпшыну. Каля брамы, як высокая зялёная вежа, горда стаяла старажытная таполя, шырока распасцёршы свае пышныя галіны.

Аднак мы крышку забеглі наперад.

На ганку я сядзеў не доўга. Выйшаў Янка Купала і даў мне кнігу. Не памятаю, ад радасці падзякаваў я за падарунак, ці не, але помню толькі, што апынуўся за брамкай, засунуў кнігу за пазуху і пабег на Старажоўку, дадому. Гэтай кнігай быў зборнік вершаў Янкі Купалы «Шляхам жыцця»...

Іван Дамінікавіч любіў дзяцей, пісаў для іх вершы і песні, часта наведваў іх у школах, бываў і дзеці частымі гасцямі ў любімага дзядзькі Янкі.

Дружбе паэта і дзяцей садзейнічала Уладзіслава Францаўна — цёця Уладзя, як яе называлі і дзеці і дарослыя. Працуючы ў дашкольным аддзеле Наркамасветы, а затым выхавацелькай у дзіцячым доме, яна апрацоўвала для дзяцей народныя песні, казкі, гульні, загадкі. У гэтай рабоце ёй памагаў Купала. Кніг для дзяцей на беларускай мове ў той час амаль не было, выдаваўся толькі часопіс «Зоркі», рэдактарам якога быў Змітрок Бядуля. У гэтым часопісе цёця Уладзя змяшчала апрацаваны ёю матэрыял, які выкарыстоўвалася для дзіцячай мастацкай самадзейнасці ў школах і дзіцячых дамах, куды на святочныя вечары з прыемнасцю хадзіў Янка Купала.

У беларускай працоўнай школе, дзе я вучыўся, быў створаны вучнёўскі літаратурны гурток, шэфам якога як прадстаўнік Наркамата асветы была цёця Уладзя. Яна забяспечвала наш гурток мастацкай літаратурай, газетамі, а таксама паперай для рукапіснага часопіса. Адной-чы Уладзіслава Францаўна прапанавала нам прыняць удзел у пастаноўцы дзіцячай п'есы «Пастушкі», якую, як яна казала, напісаў па яе просьбе малады пісьменнік Міхась Кудзелька (Чарот). П'есу меркавалася паставіць у дні канікул для школьнікаў горада. Мы, вядома, з прыемнасцю згадзіліся.

У адной з залаў Наркамасветы, які знаходзіўся ў былым архірэйскім доме, сабраліся будучыя ўдзельнікі спектакля — артысты і спевакі. Апрача членаў нашага гуртка, тут былі выхаванцы дзіцячага дома, прысутнічалі настаўнікі. Размеркаваўшы ролі, пачалі пробную рэпетыцыю. І ў гэты час прыйшоў Іван Дамінікавіч. Мы адразу сумеліся, разгубіліся, на лад справа не пайшла. Цёця Уладзя, бачачы, што яе «артысты» бянтэжацца, рэпетыцыю спыніла, збор закончыўся спевамі. Але ў наступныя разы, калі рэпетыцыі пачалі адбывацца на сцэне і мы ўжо напамяць ведалі свае ролі, нас зноў наведаў Янка Купала. Цяпер яго прыход не бянтэжыў нас, а надаваў бадзёрасці, жаданне лепш сыграць сваю ролю.

(Закончэнне на 4-й стар.).

Работнікі мастацтва рэспублікі — частыя госці купалаўскіх мясцін. Нядаўна артысты Дзяржаўнага народнага аркестра БССР наведалі Радашковічы, пабывалі каля помніка народнаму песняру Я. Купалу.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

СВЕТ МУЗЫКІ

З таго часу заняткі рэгулярна праходзяць два разы ў месяц. Заканчваецца трохгадовая праграма навучання для першага набору. Цяпер у сценах універсітэта навучаецца больш 300 чалавек. Заняткі зацікавілі жыхароў горада.

На лекцыі універсітэта прыходзяць цэлымі сем'ямі. На адных заняткох нашымі суседзямі апынуліся работнік транспарту Анатоль Іванавіч Арлоў з жонкаю, урач Абрам Іванавіч Кузняцоў з жонкаю і дачкою, пенсіянер Серафім Сяргеевіч Бакарэвіч, студэнты гідратэхнікума і індустрыяльна-педагагічнага тэхнікума, рабочыя фанера-запалкавага камбіната, хатнія гаспадыні і многія іншыя.

С. Бакарэвіч расказвае, што на заняткох універсітэта слухачы пазнаёміліся з народнай беларускай музыкай, з творчасцю выдатных дзеячоў рускай музыкальнай культуры — Глінкі, Даргамыжскага, Рымскага-Корсакава, Чайкоўскага, Мусаргскага, майстроў заходнееўрапейскага музычнага мастацтва — Гайдна, Моцарта, Шумана, Шуберта, Бетховена, Шапэна і іншых. Прыемна слухаць натхнёны расказ былога ветэрана працы і бачыць, якой радасцю свецяцца яго разумныя вочы.

На заняткох універсітэта разглядаюцца асобныя пытанні музычнай культуры: як разумець і слухаць музыку, пра музычныя формы і жанры, пра рускую музычную культуру XVII—XIX стагоддзяў, пра італьянскую оперу і г. д.

Як правіла, усе лекцыі-канцэрты ілюструюць музычна-выканаўчыя калектывы Дома культуры, музычнай школы, паказваюцца таксама кінафільмы, праводзяцца канцэрты-загадкі, якія з'яўляюцца своеасаблівымі семінарскімі заняткамі з актыўным удзелам слухачоў. Цікава праходзілі канцэрты-конкурсы, асабліва на лепшае выкананне твораў П. Чайкоўскага, душою якога былі выкладчыкі і навучэнцы музычнай школы. Гэтаму канцэрту папярэднічала некалькі заняткаў аб вялікім рускім кампазітары, прагляд і разбор кінафільмаў «Яўгеній Анегін» і «Майстры рускага балета».

Калісьці П. Чайкоўскі пісаў, што ён хацеў бы, каб музыка яго распаўсюджвалася, каб павялічвалася колькасць людзей, якія любяць яе, знаходзяць у ёй радасць. Збылася мара вялікага сына Расіі! У невялікім палескім горадзе велічна гучыць музыка П. Чайкоўскага і вялікі поспех сярод працоўных і паслужаць справе больш шырокага распаўсюджання лепшых узораў рускай класічнай, беларускай народнай, савецкай і зарубежнай музыкі. Так, справаздачны канцэрт духавога аркестра пад кіраўніцтвам дырыкора Б. Дылдзіна на фанера-запалкавым камбінаце прайшоў з вялікім поспехам. У прасторнай зале клуба не здолелі ўмясціцца ўсе жадаючыя.

У масавым распаўсюджванні музычнай культуры сярод насельніцтва павінны прыняць актыўны ўдзел партыйныя, камсамольскія, савецкія і грамадскія арганізацыі горада і раёна. Хацелася б, каб на заняткох нашага універсітэта больш частымі гасцямі былі прадстаўнікі Брэсцкага музычнага вучылішча і Саюза кампазітараў Беларусі.

Ул. БАРАВІКОЎ,
слухач Пінскага універсітэта аматараў музыкі.

Напэўна, няма такіх людзей, якія б раўнадушна ставіліся да музыкі. На жаль, не ў кожнага ёсць добры густ, і таму некаторыя захапляюцца слабымі ў мастацкіх адносінах, а то і зусім дрэннымі музычнымі творамі. Значыць, для правільнага разумення музычнага твора, як і ўсякага іншага мастацтва, патрэбны веды і навыкі, пэўнае эстэтычнае выхаванне. У Пінску сапраўднымі цэнтрамі музычнай культуры з'яўляюцца музычная школа і універсітэт аматараў музыкі.

Цікавая гісторыя гэтага універсітэта. Тры гады назад пры гарадскім Доме культуры быў адкрыты першы ў горадзе універсітэт культуры звычайнага тыпу, у якім выступалі выкладчыкі і навучэнцы музычнай школы. Па іх ініцыятыве быў створаны асобны факультэт музыкі. А пазней, у студзені 1960 г., узнік універсітэт музычнага мастацтва, або, як яго пазней назвалі па жаданню саміх слухачоў, — універсітэт аматараў музыкі.

НА ЗЯМЛІ УЗБЕКІСТАНА

Песня Янкі Купалы прыйшла і на зямлю сонечнага Узбекістана. Узбекскі чытач ведае народнага паэта Беларусі перш за ўсё па шматлікіх выданнях яго твораў на рускай мове. З рускіх перакладаў творы Я. Купалы перакладаліся і на ўзбекскую мову. У часопісе Саюза пісьменнікаў Узбекістана «Зорка Усходу» («Шарк Юлдузы», 1952 г., № 6) былі апублікаваны пераклады паэмы «Курган» і верша «Дзякуй народу». Перакладчыкам быў вядомы ўзбекскі паэт Міртэмір. Тады ж паэт Джуманіяз Джаббараў у часопісе «Жанчыны Узбекістана» выступіў з перакладамі купалаўскіх вершаў «Алеся», «А зязюля кукавала». Асобнай кніжкай для дзяцей у Дзяржаўным выдавецтве Узбекістана выйшаў у перакладзе Дж. Джаббарава верш Я. Купалы «Хлопчык і лётчык» (1952). Вершы Я. Купалы ўвайшлі ў зборнік беларускай паэзіі «Кардашлар кошуглі» («Песні сяброў», 1952).

Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры УзССР выпускае новую анталогію беларускай паэзіі, дзе мы знойдзем і новыя пераклады вершаў Янкі Купалы, зробленыя адным са старэйшых узбекскіх савецкіх паэтаў Максудам Шэйхзадэ («На смерць Сцяпана Булата», «Дзве сястры», «Зыходзіш, вёска, з яснай явы», «Госці», «Беларускім партызанам» і інш.).

Але справа не абмяжоўваецца толькі перакладамі. Вывучэнне паэзіі Янкі Купалы ўзбекскімі паэтамі вядзе да ўзаемнага ўзбагачэння братніх літаратур, да актыўнага ўспрыняцця і засваення творчай спадчыны Янкі Купалы. Так, у лірычнай вершаванай аповесці Міртэміра «Партрэт» (1956—57) адзін з фрагментаў мае паметку: «Наследаванне Янку Купалу». Справа ідзе аб імітацыі матываў верша Купалы «Ты прыйдзі» з кнігі «Шляхам жыцця».

Так паступова паэзія Янкі Купалы пачала гучаць і на мове узбекаў.

Л. СЦЯПАНАЎ.

ХРОНІКА КУПАЛАЎСКІХ ДЗЁН

ПАВЕДАМЛЕННІ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ
В. КРОЗА, М. БЕЛАДЗЕДА, І. КАСПЯРОВІЧА.

△ У сталічнай бібліятэцы імя М. Горкага адбыўся вялікі літаратурны вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы. У вечары прынялі ўдзел пісьменнікі П. Глебка, А. Астрэйка, М. Аўрамчык, народны артыст СССР П. Малчанаў, народны мастак БССР З. Азгур і іншыя.

З успамінамі аб Я. Купалу выступілі паэты П. Глебка, А. Астрэйка, скульптар З. Азгур.

Затым М. Аўрамчык і А. Астрэйка прачыталі вершы, прысвечаныя Купалу. Народная артыстка БССР С. Станюта прачытала ўрыўкі з паэмы «Курган». Народны артыст СССР П. Малчанаў расказаў аб тым, як у Тэатры імя Я. Коласа ажыццяўлялася пастаноўка п'есы «Паўлінка» і «Прымакі».

Студэнты Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Ю. Ганчароў, Г. Чарнявская і саліст Беларускай дзяржаўнай філармоніі Д. Зубрыч выканалі вакальныя творы.

△ Дзень нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы адзначаецца калгаснікамі сельгасарцелі імя Дзяржынскага Слонімскага раёна кожны год. Да гэтага дня школьнікі, моладзь, настаўнікі рыхтуюць канцэрт мастацкай самадзейнасці. Так было і ў гэтым годзе.

На вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы, у клуб сабралася многа калгаснікаў і калгасніц з вёсак Вялікая і Малая Кракотка, Рудаўка. Вечар адкрыў загадчык бібліятэкі імя Я. Купалы, якая знаходзіцца ў вёсцы Вялікая Кракотка, А. Жытневіч. Даклад аб жыцці і творчым шляху юбіляра прачытаў настаўнік Кракоцкай сярэдняй школы І. Веладзед. З чытаннем твораў Я. Купалы выступілі вучні А. Круглік, Н. Дабрынін, Л. Жытневіч і інш. З вялікім пачуццём чыталіся вершы «Мужык», «Наша моладзь», «Арлянятам», «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», «Сонца свяціла нам адналькава», «Беларускім партызанам».

Пасля даклада выступіў хор Кракоцкай школы і выканаў рад песень на словы Я. Купалы. Затым драматычны гурток паказаў камедыю Я. Купалы «Прымакі».

△ Працоўныя Мёршчыны шырока адзначаюць 80-годдзе з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Ва ўсіх культасветустановах афармлены кніжныя выстаўкі твораў юбіляра, праводзяцца літаратурныя вечары, прысвечаныя жыццю і творчаму шляху паэта.

Нядаўна жыхары раённага цэнтра запоўнілі Палац культуры. Тут адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны песняру. Даклад «Паэзія Янкі Купалы ў нашы дні» прачытала настаўніца Мёрскай сярэдняй школы Н. Капцюх.

З чытаннем вершаў Янкі Купалы выступілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Л. Грэцкая, Н. Грузневіч, Х. Юхно, З. Саронка і інш. Яны прачыталі вершы: «Мужык», «А хто там ідзе?», «Сыны», урыўкі з паэм «Безназоўнае» і «Над ракой Арэсай».

У заключэнне быў паказан мастацкі фільм «Паўлінка».

Алена ВАСІЛЕВІЧ

АПАВЯДАННЕ

Ты пайшоў насустрач вайне...

Памяці І. Я. ЛАЗОЎСКАГА

...А я ўсё спадзяюся, што, можа, здарыцца цуд. Усё нечага чакаю. А можа... А можа... Знаходзяцца ж і цяпер яшчэ, праз дваццаць гадоў, людзі, якіх лічылі загінуўшымі...

А ты... Ты не прапаў без вестак. Ты не быў паранены. Не быў кантужаны. Ты быў забіты.

Пахавальная, што некалі перавярнула і перакроіла ўсё жыццё, да мяне трапіла толькі праз дваццаць год. У паперцы гэтай рукой штабнога пісара — сінім чарнілам — было выведзена: «Загінуў смерцю храбрых у баях за Радзіму». Васемнаццатага лютага тысяча дзевяцьсот сорак другога года пад горадам Чудавам.

За дваццаць год ляжання за бажніцай у бацькавай хаце (за гэтай бажніцай некалі спачывала ўся радаслоўная сям'і, сюды складаліся метрыкі аб нараджэнні — тут чакала свае пары і твая метрыка...) гэтая паперка парудзела і сцерлася. Не сцерліся толькі няўмольныя словы: «Загінуў смерцю...» Без пары паклалі яны ў труну маці. Дачасна сагнулі бацькаву спіну, нібы сухавеем высушылі старыя вочы.

...Быў забіты васемнаццатага лютага. У мароз, мусіць, у завею. Як бег наперадзе роты з вінтоўкай наперавес, так і спатыкнуўся, так і ўпаў, не здагадваючыся, чаму раптам такім гарачым зрабіўся снег. Так, мусіць, і ляжаў на гэтым гарачым снезе, шырока раскінуўшы бязмоўныя рукі, аж пакуль не прыйшлі па цябе, позна ўжо вечарам, пасля бою.

— Эх, таварыш старшы лейтэнант... Таварыш ротны...

Я трымаю ў руках гэту бязлітасную паперку, перачытваю яе раз, другі, трэці... «Загінуў», а я не плачу. Не плачу, бо ў мяне няма слёз, як няма ўжо і нядаўняга яшчэ сумнення і надзеі: «А можа... А можа...».

Я не плачу, я толькі намагаюся прыпомніць.

Прыпомніць, а дзе ж я сама была ў той дзень, калі ты гэтак раптоўна спаткнуўся на тым гарачым снезе. Што я рабіла ў той час, калі ты лавіў апошнім позіркам папялістую хмарку ў нізкім зімовым небе і клікаў на дапамогу? Можа, і мяне клікаў...

А я нічога гэтага не ведала. Не чула. Я была ад цябе так далёка. Была там, дзе не праляцела ніводная варожая куля. Дзе людзі ні разу не пачулі гарматнага выбуху. Дзе ноччу можна было спаць, не баючыся, што цябе разбудзіць паветраная трывога...

І ты даруй мне за гэта.

Я не памятаю, што я рабіла ў той дзень. Ды напэўна ж нічога асаблівага — усё тое, што рабіла штодня. Мыла ў палатах падлогу. Прыбірала пасцелі. Карміла параненых. Напэўна яшчэ жартавала і смяялася...

І за гэта даруй мне.

Добра ведаю толькі адно, што ў той дзень — на людзях — я не паўтарала твайго імя, не расказвала, які ты быў у мяне... І ты за гэта на мяне не пакрыўдзіўся б. Тваё імя бясконца паўтарала, з табой бясконца гаварыла і клікала цябе ў той дзень (як і заўсёды тады!) маё сэрца. Каб ты ўмеў пачуць яго! Ты не застаўся б ляжаць там, пад горадам Чудавам. Ты ўстаў бы. Ты прыйшоў бы.

Як прыйшоў майскім адвячоркам, за месяц да вайны.

* * *

Не прыйшоў, а прыехаў, праўда. З другога горада, з-за свету. Не папярэдзіўшы, не напісаўшы, а так раптоўна, як снег на галаву.

І як мы стрэліся з табой у нашым інтэрнацкім калідоры...

— Ганька, цябе чакаюць...

Цікаўны, як у сытаўкі, нос Надзькі Бохан прасунуўся ў наш пакой і адразу ж знік — ого, каб без яе абышлася якая навіна.

Я кулём лячу ў калідор, лячу да дзяжурэй нашай камендантшы Лампіцкай — там заўсёды чакаюць нас усе неспадзяваныя сустрэчы і навіны...

— Добры дзень...

Ты гэтакі ўзмужнелы, загарэлы, у новенькай з іголачкі форме і шапцы, што аж у вочы коле! — курсант-выпускнік пяхотнага вучылішча!

І я, па плячо табе, шчуплае, ушчэнт збянтэжанае дзеўчанё.

— Добры дзень...

Быццам і не было той двухгадовай перапіскі штодня па пісьму.

... Не ведаю, што было б, каб не дзяўчаты, мае таварышкі. Наўрад ці адважылася б я запрасіць цябе ў пакой. Сорамна — жаніх прыехаў...

... Як далёка засталася тая сустрэча ў нашым інтэрнаце. (А, здаецца, нібыта была яна ўчора...) Колькі песень пераспявалі мы ў той вечар. Колькі высмеялі смеху. І з чаго б, здаецца? Ды ні з чаго — так сабе. Усе мы былі маладыя, бестурботныя, закаханыя. Усе мы былі шчаслівыя бесклапотным шчасцем маладосці.

А які поўнік свяціў нам у той вечар, калі я пайшла праводзіць цябе да гасцініцы! Свяціў ён і назаўтра, толькі назаўтра ён нам ужо зусім быў непатрэбным. Назаўтра мы сядзелі з табой на чужым ганку на соннай Задруцкай вулачцы і сведкі нам былі зусім лішнія... І толькі выпадковая хмарка дапамагла табе, дапамагла нам... Яна засланіла дакуку-поўніка, і ты сказаў мне... Упершыню за два гады, хоць пісем перапісалі, хоць паперы звялі мы вазы...

Днём мы блукалі па Дняпровых кручах. Сядзелі на хвоіліры. Потым каталіся на лодцы. А потым абедалі ў нашым гарадскім рэстаране: елі наронны студэнцкі вінегрэт, елі гуляш і нават выпілі — удваіх — стопку чырвонага віна... І ўсё гэта на вачах у нашых хлопцаў, маіх аднакурснікаў!

На трэці дзень ты паехаў у свой горад, даслужваць сваю службу, давучвацца на сваіх курсах. А я засталася ў сваім горадзе. Мілым зялёным гарадку ў белым цёплым пяску па калена, замкнутым у рагу двух слаўных рэчак.

Я засталася, але са мной як быццам нешта здарылася. Знікла некуды зусім нядаўняя яшчэ рагатуха, якой варта было паказаць палец, каб рассмяяцца да слёз... У мяне з'явілася дзіўнае, зусім незнаёмае пачуццё адказнасці — перад сабой і перад табой. Ты сказаў мне, што хочаш, каб мы былі заўсёды разам. І я сказала табе, што таксама хачу, каб мы заўсёды былі разам. Вось чаму адразу, як ты паехаў, я раптам неяк пасталела, нібыта падрасла. А дзяўчаты казалі (вядома, здзекваліся), што я нібыта паразумнела нават...

А потым ад цябе прыйшло пісьмо. Больш за мяне чакалі гэтага пісьма дзяўчаты нашага пакоя. Напішаш — значыць, не дарэмна прыязджаў. А не будзе пісьма, дык... (Дурныя, што яны разумелі... Нам з табою было так добра!)

І пісьмо прыйшло, аж на дванаццаці старонках!.. Памятаю, дзяўчаты ў той жа дзень на ўсіх маіх сшытках-канспектах закрэслілі маё прозвішча і падпісалі тваё...

І мне гэта было так прыемна! У мяне было такое адчуванне, нібыта маё ўласнае прозвішча мне ўжо больш было не патрэбна, нібыта яно ўжо адслужыла мне сваю службу, і таму я магла лёгка ад яго адмовіцца...

З таго пісьма мае таварышкі штодня будавалі і перабудоўвалі (як толькі ім жадалася!) наша з табой сумеснае жыццё. Я рабіла выгляд, што адбіваюся ад дзяўчат, старалася нават злавацца на іх, ды гэта мне зусім не ўдавалася: не ўмела ні прыкідвацца, ні маніць. Ды і як зманіш, калі рот у цябе да вушэй, калі на твары, як на чыстым аркушы, напісана: «Дзяўчаткі, гаварыце, што хочаце, толькі гаварыце пра яго!»

І каб ты толькі ведаў, колькі пра цябе, пра нас з табой гаварылася тады ў нашым сёмым пакоі па вуліцы Смідовіча.

Цябе дзяўчаты чамусьці толькі хвалілі. Ты і такі, ты і гэткі! Затое мяне... Затое мне даставалася! І панчохі цыраваць, як след, не ўмела... (Клапаціліся пра твае шкарпэткі...) І крупнік варыць не навучылася. (А дзе яго было навучыцца, гадуючыся па чужых людзях... Есці гэты крупнік — і то не заўсёды даводзілася). І дарасла толькі па плячо табе... (Быццам я была вінавата, быццам я сама не хацела расці...).

Але я чамусьці нічога гэтага не баялася: ведала, верыла.

І толькі пісем тваіх прагнула, як прагне чалавек напіцца ў спёку.

...Апошняя твая паштоўка прыйшла падвечар 22 чэрвеня. У гэты дзень зранку наш курс здаваў першы дзяржаўны экзамен па асновах марксізма-ленінізма. А падвечар усіх нас адправілі ўжо на акопы...

У той апошні перадваенны год любімай песняй у нас, моладзі, была «В далекий край товарищ улетает...» Мы спявалі яе лёгка, асабліва не ўдумваючыся ў сэнс яе слоў.

...Родные ветры вслед
за ним летят.
Любимый город в синей
дымке тает.
Знакомый дом, зеленый
сад и нежный взгляд.

Перайначанымі словамі гэтай песні, пачыналася і твая апошняя паштоўка:

«В далекий край, подруга,
улетаю...

Толькі не паляцяць за мною ўслед родныя вятры, толькі невядома, дзе і які будзе горад... А пра «нежный взгляд» і казаць няма чаго. Ад мяне, можа так здарыцца, хутка не будзе пісем. Тады ты не чакай, а пішы нашым дадому, на імя мае сястры Ліды. Пішы раз, другі, трэці...»

Значыць, ты ведаў?

Мне не давялося пісаць Лідзе. 26 чэрвеня па тваёй вёсцы маршыравалі ўжо немцы. А сама я праз тыдзень пасля таго, як атрымала тваю апошнюю вестку ішла ўжо ў натоўпе бежанцаў на Рэчыцу... Следам за мной, не адступаючы ні на крок, ішла вайна.

А ты... Ты пайшоў насустрач вайне.

...Дваццаць першы год пайшоў з таго зімовага дня, калі ты спаткнуўся на гарачым снезе пад горадам Чудавам. І не пачуў, як клікала цябе маё сэрца.

На маіх скронях залёг ужо зазімак. І дзеці мае ўжо выраслі... А я, як і ўсе мае абкрадзеныя вайной таварышкі-аднагодні, усё сню сваё юнацтва...

Сябры.

У час адпачынку.



Прыехала бібліятэка.

Малюнкі М. ТАРАСІКАВА.

Брэсцкая крэпасць... 22 чэрвеня 1941 года яе абаронцы аднымі з першых прынялі на сябе ўдар фашысцкіх полчышчаў. Гераізм савецкіх воінаў ніколі не памеркне. Мінаюць гады, але не змяншаецца паток людзей, што ідуць да легендарных сцен Брэсцкай крэпасці...

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

У ТЫЯ ЦЯЖКІЯ ДНІ

Праглядаючы фармуляры чытачоў Лепельскай раённай бібліятэкі, я зацікавіўся адным з іх. Ён належаў Арданові Варвары Архіпаўне, 1891 года нараджэння. У фармуляры значыліся прачытаныя за апошні час кнігі — «Апраўданыя надзеі», «Так пачынаецца жыццё», «Зверабой».

— Адна са старэйшых чытачак? — спытаўся я ў бібліятэкаркі.

— Не толькі, — зазначыла бібліятэкарка.

І мне расказалі...

* * *

Школьны двор, што пачынаўся за агародам Варвары Архіпаўны, быў повен нямецкіх салдат. У самым яго кутку сядзелі на зямлі палонныя чырвонаармейцы — знясіленыя, аброслыя, у падраным абмундзіраванні. У Варвары Архіпаўны сціснулася ад болю сэрца.

Ёй падумалася пра сыноў Валодзю і Міколу, што пайшлі ў Чырвоную Армію. Дзе яны цяпер? Фронт адышоў далёка ад Лепеля. Толькі самалёты адзін за адным раўуць у высокім, выцвілым ад спякоты, небе.

Быў канец ліпеня. У садах наліваліся бурштынам духмяныя антонаўкі. Даўкі пах кропу ішоў з агародаў. Можа, зз апошнія дзесяць год не было такога ўраджаю на агуркі, моркву, цыбулю. Толькі агарод Варвары Архіпаўны спусцеў за месяц. Хто ж будзе чакаць, пакуль даспее тая бульба-скараспелка, калі з-за дроту глядзяць на цябе змораныя, галодныя людзі? Некаторых палонных Варвара Архіпаўна ўжо ведала. Не, яны нічога не прасілі. Яны нават не скардзіліся ёй. Кожную раніцу яна накопвала паўвядзёрка бульбы, варыла і несла да дроту. Палонныя бралі бульбу, баязліва азіраючыся, і гаварылі толькі два словы:

— Дзякуй, матуля!..

Насіла Варвара Архіпаўна і моркву. Насіла яблыкі. Хай сабе яны былі і не даспелыя. Абы толькі падтрымаць іх, галодных. Падтрымаць толькі... Колькі было той бульбы! А палонных прыбаўлялася кожны дзень...

Неяк увечары Мікалай Рыгоравіч, гаспадар, доўга тупаў у сенцах, перакладаючы з кута ў кут розныя рэчы.

— Чаго ты там шукаеш? — спытала жонка.

— Тут ляжала калісьці старая Валодзева вопратка.

Варвара Архіпаўна здагадалася, навошта Мікалаю яка.

— Давай сюды... — гаворыць Варвара Архіпаўна і бярэ вопратку.

Яна ціхенька выходзіць з хаты. Цёплы ліпеньскі вечар. Цішыня. Толькі настырна гудуць камары. Варвара Архіпаўна асцярожна ідзе ўздоўж град у самы куток агарода. Вось і дрот. За ім, прытуліўшыся адзін да аднаго, ляжаць людзі. Нехта ўбачыў яе і паціху папоўз да дроту.

— Гэта ты, Міхал?

— Я...

— Хадзем!

Яшчэ ўдзень Варвара Архіпаўна зрабіла пралаз у агародзе. Яна шэпча:

— Ціхенька... Вось сюды...

Потым, прыгінаючыся, ідзе ў маленькую лазню на агародзе. Міхал ідзе за ёю. Яна кладзе вопратку.

— Пераапранайся. Толькі не баўся, бо няма часу.

Міхал скідае абмундзіраванне. Варвара Архіпаўна чуе, як часта дыхае чалавек. Мусіць, хвалюецца вельмі.

— Гатова, — шэпча ён.

Яны выйшлі з дому і вузкім цёмным завулкам пачалі спускацца да возера. У высокім пахучым аеры знайшлі лодку.

— Вось так роўна, на той бераг кіруйся, — сказала Варвара Архіпаўна. — Тут усяго з паўкіламетра. Выйдзеш на бераг і налева, у лес. Там сустрэнуць цябе. Там свае збіраюцца...

Праз некалькі дзён Арданові накіравалі з фашысцкага лагера ў партызанскі атрад яшчэ аднаго палоннага, потым — трэцяга.

Аднойчы раніцаю да Варвары Архіпаўны прыбегла суседка, усхваляваная і крыху злосная.

— Вось няшчасце на маю галаву! — зашаптала яна.

— Што здарылася? — спыталася гаспадыня.

— Прыцягнулася ў хату жанчына з дзіцём. І мяне і дзяцей з-за яе схопяць... Яўрэйка...

— Дык чаго ты да мяне прыбегла?

— Параіцца.

— Нічога я табе параіць не магу, — і крыху падумаўшы, яна дадала: — Хай у мяне пабудзе дзень-два.

Жанчына перайшла ў хату Ардановічаў. Гэта была яшчэ маладая маці з маленькай дзяўчынкай. Варвара Архіпаўна даведалася, што прозвішча жанчыны Шур, завуць Рая. Яна пеша прайшла з Лагойска да Лепеля. Думала, што ўдасца ўцячы, але фронт яе апярэдзіў. Па дарозе загінуў муж і старэйшы сын Рома.

Два дні жанчына не выходзіла з каморкі — спала. Потым сабраліся ўсёй сям'ёй і вырашылі, што ўночы Мікалай Рыгоравіч пераправіць Раю праз возера. А маленькая двухгадовая Алачка застанецца ў Ардановічаў.

Восенню сям'я Варвары Архіпаўны зноў павялічылася. І здарылася гэта так.

Фашысцкія карнікі лютавалі ў навакольных вёсках, палілі, расстрэльвалі, гналі людзей у Нямеччыну. Вераснёўскім днём карнікі прыгналі ў Лепель групу дзяцей і замкнулі ў школе. Варвара Архіпаўна даведалася, што дзяцей збіраюцца вывезці ў Германію. Яна прабралася ў школу і першых, што трапіліся на вочы, забрала з сабою... Іх было пяць — Рагіна Маслоўская, Ганна Хвошч, Паліна Жарнасек, Марыя Хвошч, Паўлік Маслоўскі.

Хутка надышла зіма. Вось калі стала цяжка Варвары Архіпаўне і Мікалаю Рыгоравічу... Дзе набрацца абутку, вопраткі? Цэлымі днямі дзеці сядзелі ў хаце. З аднаго боку, гэта было і добра: не так будзе кідацца людзям у вочы вялізная сям'я.

І ўсё ж вясной, калі сышоў снег, стала цёпла і дзеці гуртам выйшлі на вуліцу, — прыкмецілі іх нядобрае вока здрадніка Пліпа Саўчыка. Ён спыніўся ля хаты, кідаючы падазроныя позіркі.

— Нешта ты напладзіў за зіму...— кінуў Пліп Мікалаю Рыгоравічу.

Мікалай Рыгоравіч нічога не адказаў. А Пліп дапытваўся:

— Дзе гэта назбіралі?

— Жончыны пляменніцы.

— Пляменніцы... У вас, здаецца, такой і радні не было.

— Як гэта не было! У Поўсвіжы сястра і двое дзяцей, у Завідрыне сястра...

— Ну, а вось гэта? — Саўчык зірнуў на Алачку.

— Гэта? — Мікалай Рыгоравіч крыху разгубіўся. — І гэта сваячка... Што зробіш... Удалася такая чарнявая...

— Я даведаюся, Мікола! — прыгразіў Пліп.

Праз некалькі дзён у двор уляцелі карнікі з аўтаматамі. Варвару Архіпаўну схапілі і прывялі ў камендатуру. За сталом, у глыбокім крэсле — нямецкі афіцэр. Побач — Пліп, салдаты. Афіцэр нешта спытаў і перакладчык адразу пераказаў:

— Чыіх хаваеш дзяцей?

— Мае дзеці.

— Усе твае?

— І сваякоў. Сястра загінула ў Поўсвіжы. Дык няўжо ж я кіну дзетак?

— Хлусіш! — зароў Пліп.

— Навошта мне хлусіць...

— Партызанскія дзеці? — спытаўся афіцэр.

— Не... — у Варвары Архіпаўны перасохла ў роце.

Пліп ляснуў па стале круглай гумавай палкай.

Жанчына праседзела ў камендатуры цэлы дзень. Падвечар яе зноў павялі на допыт.

— Мае дзеці... Сваякоў... — не адступала Варвара Архіпаўна.

— Застрэліць яе, — прашыпеў Пліп.

Афіцэр махнуў рукой.

Варвару Архіпаўну штурхнулі і павялі з камендатуры ў бок чыгункі. Там былыя кар'еры. Адтуль іншы раз далятаюць стрэлы. Ісці зусім недалёка. Каля ямы загад: «Стой!» І раптам здалёк крык:

— Пачакай, пачакай!

Да кар'ераў беглі людзі.

Цудам засталася жыць Варвара Архіпаўна. Даведаліся, аказваецца, суседзі, што арыштавалі яе, і кінуліся да каменданта. Падалі заяву: яны, жыхары, пацвярджаюць, што дзеці, якія жывуць у Мікалая Ардановіча і Варвары Архіпаўны, — сапраўды іх сваякі.

Ішоў час.

Кожны дзень прыносіў у Лепель радасныя весткі. На Волзе разгромлена армія захопнікаў. Адкаціліся фашысты ад Ленінграда, уцякаюць з Крыма. Гарача стала акупантам у Беларусі.

А сям'я ў Варвары Архіпаўны зноў павялічылася на двух дзяцей: прыйшлі ў Лепель з нейкай далёкай вёскі, з-пад Оршы. Удалося выратаваць з палону яшчэ чатырох чырвонаармейцаў. Пераапранулі іх і ўночы на лодцы адправілі на другі бераг возера, да партызан.

А неўзабаве ўсёй вялікай сям'ёй беглі па шашы насустрач савецкім танкам.

* * *

Цяпер сям'я Ардановічаў жыве ў тым самым доме, што і ў гады вайны. Вакол дома шапаціць лісцем малады сад. Сёлета ён добра цвіў. Будзе многа яблыкаў і груш.

Мы сядзім на вуліцы, гутарым. Выціраючы хусцінкай вочы, Варвара Архіпаўна ўспамінае пра тыя дні. Цяпер ёй 71 год. Але ў памяці захавалася ўсё. Яе расказ дапаўняюць Мікалай Рыгоравіч і Ніна. У Ніны сын Сашка. Яму дзесяць гадоў. Сашку цікава паслухаць пра вайну.

— Каб вы трохі раней прыехалі, — гаворыць мне Варвара Архіпаўна, — дык засталі б тут Алачку.

І я даведаўся пра лёс дзяцей.

Ала Шур разам з маці жыве ў Віцебску. Нядаўна Ала выйшла замуж. Ганна Хвошч стала настаўніцай і працуе ў Завячэрынскай сямігадовай школе Ушацкага раёна. У вёсцы Завыдрына гэтага ж раёна жывуць Марыя Хвошч і Рагіна Маслоўская. Каця Маслоўская працуе медыцынскай сястрой і жыве на Украіне. У вёсцы Цербяшова Сіроцінскага раёна працуе Павел Маслоўскі. Выйшла замуж і жыве ў Лепелі Паліна Жарнасек. Амаль кожны дзень яна заходзіць да Ардановічаў. На малаказаводзе працуе слесарам Пеця. Ніна — у сталовай...

У часе нашай гутаркі прыйшла Паліна Жарнасек. Убачыўшы ў мяне фотаапарат, папрасіла:

— Сфатаграфуйце на памяць...

Яны селі: Мікалай Рыгоравіч, Паліна, Варвара Архіпаўна, Ніна і яе сын Сашка.

Ул. СЯРГЕЕЎ.

ШЧЫРАЕ СЭРЦА ПЕСНЯРА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

Спектакль адбыўся ў Мінскім гарадскім тэатры (цяпер Тэатр імя Янкі Купалы). Партэр і ярусы былі запоўнены дзецьмі і настаўнікамі. У ложы сядзелі разам з прадстаўнікамі Наркамасветы Янка Купала і аўтар п'есы Міхась Чарот.

Мне не пашанцавала. На гэтым спектаклі я застудзіў ногі і цяжка захварэў, відаць, таму, што, выконваючы ролю пастушка, выбягаў на сцэну босы. З высокай тэмпературай я быў надоўга прыкуты да ложка. З удзячнасцю ўспамінаю, што наведваць мяне хворага прыходзіла цёця Уладзя, часта прыводзіла з сабой доктара і кожны раз прыносіла штосьці смачнае.

* * *

У зборніку верша «Шляхам жыцця» на спецыяльнай укладцы быў змешчаны партрэт Янкі Купалы. Асцярожна вырваўшы з кнігі гэты лісток з партрэтам, я павесіў яго на сцяну поруч з сямейнымі фатаграфіямі.

— Запыліцца так, — сказала маці, — варта было рамачку зрабіць ды ашкліць яе.

— Лёгка сказаць — зрабіць, для гэтага трэба мець інструмент, а галоўнае, умець сталярнічаць. Гэта не абцасы клеіць, на што я ўжо быў добрым майстрам. Аднак, правільна, рамка ўсё ж патрэбна. Толькі дзе яе ўзяць?

Наш дом стаяў каля самай Старажоўскай царквы, дзе я адну зіму быў панамаром, і мне вядомы былі ўсе яе закуткі. Я успомніў, што ў гэтай царкве, ля ўсходак на званіцу, ёсць каморка, у якой звалена шмат абразоў, і можна ўзяць любы, які толькі спадабаецца. Не марудзячы, я пабег у царкву, зайшоў у тую каморку, дзе навалам ляжалі абразы. Перабраўшы іх, выбраў, як мне здавалася, самы лепшы, пазалочаны, са шклом. Выняўшы, не памятаю, хрыста ці багародзіцу, я прынёс раму дадому і ўставіў у яе партрэт Купалы.

Убачыўшы гэты партрэт, цёця Уладзя, ухмыляючыся, сказала:

— Добра ты шануеш дзядзьку Янку...

Не магла яна не расказаць аб гэтым Івану Дамінікавічу, які не раз пасля жартаваў:

— Прынёс бы ты, Андрэйка, паказаць той абразок, дзе мяне за святога Івана-хрысціцеля выдаеш.

* * *

У пачатку 20-х гадоў Я. Купала, працуючы рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, шмат увагі аддаваў афармленню першых школьных падручнікаў на беларускай мове, кніжак для дзіцячага чытання. Паліграфічная база ў той час была вельмі беднай, выдаваліся кніжкі для дзяцей адной фарбай, з малюнкамі, выразанымі на лінолеуме. Янка Купала раіў мастакам выкарыстоўваць літаграфскі спосаб: пераводзіць малюнкі на камень, што давала магчымасць рабіць адбіткі ў дзве, а то і тры фарбы. Дзякуючы намаганням і настойлівасці Купалы дзеці атрымоўвалі за год дзве-тры кніжкі казак з каляровымі ілюстрацыямі.

Час ішоў. Патрабаванні на дзіцячую кнігу раслі, а друкарская тэхніка задаволіць гэтыя патрэбы не магла.

У рэдакцыйным партфелі дзіцячага сектара выдавецтва ляжала ўжо шмат падрыхтаваных да друку рукапісаў.

Сярод работнікаў дзіцячай літаратуры ўзнікла ідэя хадайнічаць аб стварэнні ў Мінску спецыяльнага дзіцячага выдавецтва.

Некалькі чалавек, у тым ліку і аўтар гэтых радкоў, паехалі ў Маскву на прыём да Надзежды Канстанцінаўны Крупскай, якая працавала кіраўніком Галоўпалітасветы.

Надзежда Канстанцінаўна прыняла нас, уважліва выслухала, прагледзела выданні кніг на беларускай мове, якія мы прывезлі з сабой.

Помню, Н. К. Крупская сказала, што ў бліжэйшы час стварэнне беларускага выдавецтва для дзяцей справа нерэальная: няма для гэтага паліграфічнай базы, фондаў паперы і кадраў, але паабяцала памагчы перыядычна выдаваць кнігі на беларускай мове ў выдавецтвах Масквы.

З вялікім уздымам праходзіла ў Мінску падрыхтоўка да выдання кніг у цэнтральных выдавецтвах. Янка Купала прымаў актыўны ўдзел у выбары твораў для выдання, даваў парады, як лепш іх ілюстраваць, і быў вельмі рады, калі кніжкі, прыгожа афармленыя, вялікімі тыражамі неўзабаве былі надрукаваны ў Маскве і прывезены для продажу ў Мінск.

* * *

Добрае і ласкавае сэрца было ў Івана Дамінікавіча. Аднойчы здарылася бяда з маім маленькім сынам. Я быў з ім у лазні і выпала так, што малы ашпарыў руку. Ад болю ён моцна плакаў, і што я ні рабіў, не мог яго супакоіць. Дом Я. Купалы знаходзіўся насупраць лазні (перайсці толькі вузкую вулачку), і я, усхваляваны, прыбег з сынам на руках да Івана Дамінікавіча. Трэба было бачыць, як Янка Купала стараўся зрабіць усё, каб хлопчыку палепшала, каб ён перастаў плакаць. Іван Дамінікавіч прынёс з кухні талерку з яйкамі і стаў разбіваць іх і мазаць хворую руку. Затым, перавязаўшы хлопчыку руку ручніком, ён пачаў хадзіць з ім па пакоі, пакуль той не перастаў плакаць.

Не адзін раз мне даводзілася бачыць на кватэры Івана Дамінікавіча выхаванцаў дзіцячага дома. Прыходзілі яны да свайго дзядзькі Янкі з падарункамі, зробленымі ўласнымі рукамі. Часцей за ўсё гэта былі малюнкі, што раскрывалі змест прачытаных купалаўскіх твораў.

За шырокім сталом, п'ючы чай з пірагамі і цукеркамі, дзеці чыталі паэту яго вершы, спявалі песні, расказвалі аб вучобе, аб сваіх прыгодах, аб марах-летуценнях.

Праз гады многія дзеці сталі на самастойную дарогу жыцця. Раз'ехаліся працаваць, хто настаўнікам, хто агранамам. Але заўсёды, калі здаралася зноў бываць у Мінску, яны лічылі сваім абавязкам наведаць Івана Дамінікавіча, каб прывітаць яго, пажадаць здароўя і выказаць яму сваю падзяку за шчырую бацькоўскую любоў і ласку, што пакінулі ў іх памяці светлы, незабыўны след.

Семінар бібліятэчных работнікаў

На працягу трох дзён у Навагрудку працаваў семінар загадчыкаў гарадскіх, раённых і пасялковых бібліятэк Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. Удзельнікі семінара праслухалі даклад аб вопыце работы Навагрудскай раённай бібліятэкі імя М. Багдановіча, які зрабіла яе былая загадчыца тав. Русановіч. Вопытам работы Шчучынскай бібліятэкі падзяліліся тав. Краснашчокіна. Аб пастаноўцы масавай, даведачна - бібліяграфічнай работы ў Навагрудскай бібліятэцы гаварыла тав. Шыкуць, а загадчыца Ляхавіцкай бібліятэкі тав. Конарава падрабязна расказала, як у іх вядзецца прапаганда сельскагаспадарчай літаратуры.

З цікавым аглядам бібліяграфічных дапаможнікаў выступіла супрацоўніца Дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна тав. Дземчанава.

І. РАСЕНІН.

На братняй сцэне

Магілёўскі драматычны тэатр, які знаходзіцца на гастролях у горадзе Станіславе (Украінская ССР), паказаў мясцоваму гледачу сваю новую работу — спектакль па п'есе «Калі любіш» М. Гарулёва. Спектакль паставіў рэжысёр В. Шутаў. Мастацкае афармленне М. Волахава. У галоўных ролях — артысты С. Бульчык, М. Радзіёнаў, М. Казінін, Н. Фаворская, В. Дружноў, Е. Кашына.

Пісьмо ў рэдакцыю

Дзякуем усім арганізацыям, сябрам і таварышам, якія выказалі сваё спачуванне ў сувязі з напаткаўшым нас горам — смерцю нашага незабыўнага бацькі і мужа — народнага артыста РСФСР С. С. Бірукова.

В. П. РЭДЛІХ,
Е. С. БІРУКОВА.

НАВІНЫ КІНО ЗА РУБЯЖОМ

ІТАЛІЯ Экранізацыю сатырычнага рамана Альберто Маравія «Раўнадушныя» (1929 г.), прысвечанага быту і маралі італьянскай буржуазіі ў гады станаўлення ў краіне фашысцкага рэжыму, ажыццяўляе рэжысёр Франчэска Мазелі з удзелам папулярных акцёраў Дэбары Кер (ЗША) і Клаўдзіі Кардзінале (Італія).

* * *

Італьянскі рэжысёр Франчэска Розі да гэтага часу быў вядомы як аўтар фільмаў «Выклік» і «Прайдзісветы». Цяпер ён закончыў новую карціну, якая прынесла яму славу самага смелага рэжысёра Італіі. Справа ў тым, што яго новы фільм «Сальваторэ Джуліяна» расказвае пра кіраўніка сіцыліянскай паўлегальнай тэрарыстычнай арганізацыі, мафіі — Джуліяна. Самога Джуліяна няма ў жывых, але мафія дзейнічае і цяпер, і да гэтага часу ніхто не адважваўся паказаць у фільме злачынствы гэтай банды.

Франчэска Розі, які ставіў фільм у Сіцыліі, не раз атрымліваў пагражальныя пісьмы, а адзін работнік здымачнай групы быў забіты членамі мафіі. Цяпер, калі фільм выйшаў на экран, у цітрах названы толькі два выканаўцы. Большасць роляў рэжысёр даверыў непрафесіянальным акцёрам, імёны якіх, баючыся помсты мафіі, ён не называе. Ролю Сальваторэ Джуліяна іграе малады механік з Палерма.

ПОЛЬШЧА У варшаўскіх кінатэатрах з вялікім поспехам ідзе фільм «Заўтра прэм'ера» (па матывах вельмі папулярнай камедыі Ежы Юрандота «Трэці званок»). Рэжысёр і аўтар сцэнарыя — Януш Маргенштарн. У галоўных ролях — Ірэна Малькевіч, Вянчыслаў Глінскі, Каліна Яндрусік, Густаў Галаўбек і яшчэ рад акцёраў тэатраў і кіно.

ААР Папулярная егіпецкая кінаактрыса Фацен Хамама (у Савецкім Саюзе дэманстраваліся фільмы з яе ўдзелам: «Барацьба ў даліне», «Сустрэча са шчасцем», «Кахание і слёзы») здымаецца цяпер у фільме «Джэн Эйр» па раману Шарлоты Брантэ.

АНГЛІЯ Пасля дваццацігадовага перапынку вяртаецца на экран кінаэорка Грэта Гарбо. Яна заключыла дагавор з адной з англійскіх фірм на выкананне ролі састарэлай балерыны ў экранізацыі рамана Румера Годэна «Свечка для святой Юліі».

ФРГ Адна з заходнегерманскіх кінафірм пачала экранізацыю трагедыі Шылера «Марыя Сцюарт». На ролю Марыі зацверджана Марыя Шэл (знаёмая нашаму гледачу па фільмах «Жэрвеза», «Роза Бернд» і «Пакуль ты са мною»). Каралеву Елізавету іграе Лілі Пальмер. Гэта першы фільм, у якім іграюць разам абедзве папулярныя артысткі.

ФРАНЦЫЯ Вядомы французскі кінаакцёр Крысціян Маркан прыступіў да экранізацыі рамана Жана Жыано «Вялікая дарога». Крысціян Маркан будзе рэжысёрам-пастаноўшчыкам фільма і выканаўцам галоўнай ролі.

У пачатку 1963 года ў Францыі пачнуцца здымкі фільма аб жыцці вядомага паэта XIX стагоддзя Арцюра Рамбо (1854—1891). Назва фільма — «Чвэртка года ў пекле» (так называўся адзін са зборнікаў Рамбо, у якім былі яго вершы і проза). Рэжысёр-пастаноўшчык Жан Габрыэль Альбікако. У ролі самога Рамбо выступіць папулярны акцёр Ларан Тарзіеф, у ролі яго сябра, паэта Поля Верлена — Жарс Уілсан, знаёмы нам па фільму «Такая доўгая адсутнасць», што выйшаў на нашы экраны.

ВАШЫНГБОНСКІ САМАВАР

Вонскія заправілы не толькі не жадаюць ліквідаваць рэшткі другой сусветнай вайны, а, наадварот, раздзьмухваюць гэтае тлеючае вугалле, рыхтуючы бундэсвэр да рэваншу.

З газет.

ЗНАЁМАЯ РАБОТА ЗНАЁМАГА БОТА. Мал. М. ЖЫТНІЦКАГА.

ІХ НОРАВЫ, ІХ МАРАЛЬ

Факты з зарубежных газет і часопісаў

ТАЛЕНТЫ І ПРЫХІЛЬНІКІ

Сіньёр Дуіліо Сусмель, аўтар капітальнай працы аб жыцці Мусаліні, наведаў нядаўна Іспанію па персанальным запрашэнні генерала Франко. Дуіліо Сусмель падарыў генералу Франко 34 тамы сваёй працы. Апошні, 35-ы том выйдзе хутка з друку і будзе неадкладна дасланы генералу Франко.

«Таймс».

ГЕРЦАГІНЯ РАТУЕ МАНАКО

Манакская герцагіня Грэйс (былая галівудская кінаэорка Грэйс Келі. — Рэд.) прыняла запрашэнне галівудскага кінарэжысёра і прадзюсера Альфрэда Хічко ўдзельнічаць у здымках новага крымінальнага фільма. Герцагства Манако перажывае цяпер фінансавы крызіс, і герцагіня згадзілася на ўдзел у здымках з чыста патрыятычных меркаванняў. Яна спадзяецца, што восем мільёнаў марак яе гонарару пакрыюць дэфіцыт у бюджэце герцагства. У кантракце, нядаўна падпісаным у Галівудзе, герцагіня прадугледзела, што роля ў фільме не будзе кампраметаваць яе герцагскую годнасць. Асобна агаворана, што ў сцэнах, дзе будзе ўдзельнічаць герцагіня Грэйс, не будзе ні папалункаў, ні якіх-небудзь непрыстойных рухаў.

«Вельт».

«ХОРСІ-ХОРСІ»

Каб прыцягнуць да гульні ў таталізатар публіку, якая не мае магчымасці траціць на іподром у час правядзення конных спаборніцтваў, некаторыя прадпрымальнікі арганізавалі новы атракцыён «хорсі-хорсі». На экране дэманструюцца фрагменты з розных кінакарцін, галоўным чынам каўбойскіх баявікоў, у якіх ёсць сцэны пагоні на конях, а гледачы робяць стаўкі на таго ці іншага каня, як у звычайным таталізатары.

«Морген».

«ДАБРАЧЫНЦЫ»

Сем мільёнаў крон пакінуў шведскі мільянер Ханко, які нядаўна памёр. У завяшчанні агаворана, што гэтая сума павінна быць выдаткавана на карысць сабак паўднёвых абласцей Швецыі. Жонка мільянера, па паходжанню бельгійка, памерла два гады назад, адпісаўшы ўсё сваё багацце — каля пяці мільёнаў — бельгійскім сабакам.

«Фольксштыме».

ЛЯ ФАНТАНА

У цэнтры Рыма, дзе знаходзіцца адзін з найславуцейшых фантанаў «Фантана Трэві», чатыры гады назад адна з французскіх кінаэорак распрачулася на вачах у натоўпа, акупулася ў басейн і паказала прысутным сцэнку — «Афрадзіта, якая выходзіць з марской пены». Гэта выклікала сенсацыю, і з таго часу фантан стаў месцам паломніцтва кінаэорак, якія стараюцца стварыць сабе рэкламу. Асабліва многа «Афрадзіт» з'яўляецца ў вячэрні час, калі фантан асвятляецца пражэктарамі. Цяпер ля фантана ўстаноўлены паліцэйскі пост з кругласутачным дзяжурствам.

«Фольксштыме».

ЛЁС АКТРЫСЫ

У адным з маленькіх рэстаранчыкаў Манхетэна (Нью-Йорк. — Рэд.) карэспандэнт выпадкова сустрэў Вераніку Лэйк. У 40-х гадах яна лічылася буйнейшай кінаэоркай Галівуда. Цяпер яна зарабляе на жыццё мыццём талерак у рэстаранчыку трэцяга разраду. На пытанне карэспандэнта, ці жадала б яна зноў вярнуцца на сцэну, Вераніка Лэйк рашуча адказала: «Не».

«Юманіта».

ЮНЫЯ ГАНГСТЭРЫ

Мюнхенская паліцыя затрымала групу школьнікаў, якія намерваліся абрабаваць ашчадкасу. План нападу быў распрацаваны ва ўсіх падрабязнасцях. Спачатку — напасці на газетны кіёск, каб здабыць грошай на куплю зброі, потым украсці тры аўтамабілі, неабходныя для ўцёкаў пасля абрабавання ашчаднай касы. Прыкладам для юных рабаўнікоў з'явіліся гангстэрскія фільмы і коміксы.

«Морген».

РЭКОРД НЕ ПАБІТЫ

Каманда студэнтаў Каліфарнійскага політэхнічнага каледжа зрабіла няўдалую спробу пабіць рэкорд даўжыні размовы з тэлефона-аўтамата. Апусціўшы адну манету ў вулічны аўтамат, яны па чарзе працягвалі размову з выкліканым абанентам. Размова адбывалася на працягу 220 гадзін. Гэта значна менш сусветнага рэкорда, устаноўленага нядаўна камандай Тэхаскага тэхналагічнага каледжа. Тэхаскім студэнтам удалося, укінуўшы адну манету, заняць тэлефон-аўтамат на 468 гадзін!

«Юманіта».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. П. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА

«Літаратура и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 13166.

Друкарня выдавецтва «Звязда».